ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 35-ы
№ 32 (2085)
19 красавіка 1966 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ДЗЕЯЧЫ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА! ЗМАГАЙЦЕСЯ ЗА ПАРТЫЙНАСЦЬ І НАРОДНАСЦЬ, ВЫСОКУЮ ІДЭЙНАСЦЬ І МАСТАЦКАЕ МАЙСТЭРСТВА ТВОРАЎ! ЯРЧЭЙ АДЛЮСТРОЎВАЙЦЕ ВЕЛІЧ І ПРЫГАЖОСЦЬ ГЕРАІЧНЫХ СПРАЎ САВЕЦКАГА НАРОДА, ЯГО ПАЛЫМЯНЫ ПАТРЫЯТЫЗМ, БАРАЦЬБУ ЗА ПЕРАМОГУ КАМУНІСТЫЧНЫХ ІДЭАЛАЎ!

З Заклікаў ЦК КПСС да 1 Мая 1966 года.

ЗАКЛІКІ ЦК КПСС ДА 1 МАЯ 1966 ГОДА

1. Няхай жыве 1 Мая — Дзень міжнароднай салідарнасці працоўных, дзень адзінства і брацтва рабочых усіх краін!

2. Няхай жыве рабочы клас усяго свету! Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

3. Няхай жыве марксізм-ленінізм — вечна жывое ўсёперамагаючае рэвалюцыйнае вучэнне!

4. Працоўныя Савецкага Саюза! Усе сілы на ажыццяўленне рашэнняў XXIII з'езда КПСС, на выкананне пяцігадовага плана!

Наперад да новых перамог у барацьбе за трыумф камунізма ў нашай краіне!

5. Палымянае прывітанне брацкім камуністычным і рабочым партыям — баявому авангарду рабочага класа і ўсіх працоўных!

6. Няхай жыве адзінства і згуртаванасць міжнароднага камуністычнага руху на аснове марксізма-ленінізма, пралетарскага інтэрнацыяналізму, Дэкларацыі і Заявы Маскоўскіх нарад!

7. Народы краін сацыялізма, народы, якія вядуць нацыянальна-вызваленчую барацьбу, працоўныя ўсяго свету! Аб'ядноўвайце свае намаганні ў барацьбе супраць імперыялізму і каланіялізму, за нацыянальнае вызваленне, за мір, дэмакратыю і сацыялізм!

8. Народы ўсіх краін! Выкрывайце падкопы імперыялістычных падпальшчыкаў вайны! Узмацняйце барацьбу за спыненне гонкі ўзбраенняў, забарону ядзернай зброі, усеагульнае і поўнае раззбраенне, за мір ва ўсім свеце!

9. Народы свету! Змагайцеся за спыненне ваеннай інтэрвенцыі амерыканскага імперыялізму ў В'етнаме, патрабуйце неадкладнага вываду ўзброеных сіл ЗША з Паўднёвага В'етнама, прадастаўлення в'етнамскаму народу магчымасці самому вырашаць свае справы!

Няхай шырыцца і мацнее міжнародная салідарнасць з гераічным в'етнамскім народам!

10. Няхай развіваецца і мацнее дружба і супрацоўніцтва народаў еўрапейскіх дзяржаў у інтарэсах умацавання міру і бяспекі ў Еўропе.

11. Народы свету! Змагайцеся супраць імперыялістычных планаў стварэння шматбаковых ядзерных сіл НАТО, супраць допуску заходнегерманскіх рэваншыстаў да ядзернай зброі!

12. Народы ўсіх краін! Дабівайцеся ўтаймавання рэваншысцкіх і мілітарысцкіх сіл Заходняй Германіі, строгага пакарання нацысцкіх ваенных злачынцаў, заключэння германскага мірнага дагавору!

13. Няхай жыве сусветная сацыялістычная сістэма — галоўная заваёва міжнароднага рабочага класа і ўсіх працоўных!

Няхай мацнее згуртаванасць, брацкая дружба і адзінства народаў усіх краін сацыялізма!

14. Брацкае прывітанне працоўным Народнай Рэспублікі Балгарыі, якія будуюць сацыялізм! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж савецкім і балгарскім народамі!

15. Брацкае прывітанне працоўным Венгерскай Народнай Рэспублікі, якія будуюць сацыялізм! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж савецкім і венгерскім народамі!

16. Брацкае прывітанне працоўным Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам, якія будуюць сацыялізм, змагаюцца супраць амерыканскіх агрэсараў, за мірнае аб'яднанне сваёй краіны на дэмакратычных асновах! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж савецкім і в'етнамскім народамі!

17. Брацкае прывітанне працоўным Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, якія будуюць сацыялізм! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж народамі Савецкага Саюза і ГДР!

18. Брацкае прывітанне працоўным Кітайскай Народнай Рэспублікі, якія будуюць сацыялізм! Няхай жыве згуртаванне вялікіх народаў Савецкага Саюза і Кітая ў барацьбе супраць імперыялізму і каланіялізму, за мір, дэмакратыю, сацыялізм і камунізм!

19. Брацкае прывітанне працоўным Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі, якія будуюць сацыялізм, змагаюцца за мірнае аб'яднанне сваёй краіны на дэмакратычных асновах! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж савецкім і карэйскім народамі!

20. Брацкае прывітанне гераічнаму народу Кубы, які будуе сацыялізм! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж савецкім і кубінскім народамі!

21. Брацкае прывітанне працоўным Мангольскай Народнай Рэспублікі, якія будуюць сацыялізм! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж савецкім і мангольскім народамі!

22. Брацкае прывітанне працоўным Польскай Народнай Рэспублікі, якія будуюць сацыялізм! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж савецкім і польскім народамі!

23. Брацкае прывітанне працоўным Сацыялістычнай Рэспублікі Румыніі, якія будуюць сацыялізм! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж савецкім і румынскім народамі!

24. Брацкае прывітанне працоўным Чэхаславацкай Сацыялістычнай Рэспублікі, якія будуюць сацыялізм! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж савецкім і чэхаславацкім народамі!

25. Брацкае прывітанне працоўным Народнай Рэспублікі Албаніі, якія будуюць сацыялізм! За дружбу і супрацоўніцтва паміж савецкім і албанскім народамі!

26. Брацкае прывітанне працоўным Сацыялістычнай Федэратыўнай Рэспублікі Югаславіі, якія будуюць сацыялізм! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж народамі Савецкага Саюза і Югаславіі!

27. Гарачае прывітанне народу Аб'яднанай Арабскай Рэспублікі, які будуе незалежную, нацыянальную, дэмакратычную дзяржаву, змагаецца за сацыялістычнае развіццё сваёй краіны! Няхай развіваецца і мацнее дружба і супрацоўніцтва паміж народамі Савецкага Саюза і Аб'яднанай Арабскай Рэспублікі!

28. Гарачае прывітанне гераічнаму народу Алжыра, які будуе незалежную нацыянальную дзяржаву, змагаецца за сацыяльны прагрэс сваёй краіны! Няхай развіваецца і мацнее дружба і супрацоўніцтва паміж народамі Савецкага Саюза і Алжырскай Народнай Дэмакратычнай Рэспублікі!

29. Гарачае прывітанне народу Сірыйскай Арабскай Рэспублікі, які змагаецца за дэмакратычную дзяржаву, за сацыяльны прагрэс сваёй краіны! Няхай развіваецца і мацнее дружба і супрацоўніцтва паміж народамі Савецкага Саюза і Сірыйскай Арабскай Рэспублікі!

30. Гарачае прывітанне народам Бірмы, якія змагаюцца за незалежную дэмакратычную дзяржаву, за сацыяльны прагрэс сваёй краіны! Няхай развіваецца і мацнее дружба і супрацоўніцтва паміж народамі Савецкага Саюза і Бірмы!

31. Гарачае прывітанне народам Гвінеі, Конга (Бразавіль) і Малі, якія будуюць незалежныя, нацыянальныя, дэмакратычныя дзяржавы, змагаюцца за сацыяльны прагрэс сваіх краін! Няхай развіваецца і мацнее дружба і супрацоўніцтва паміж народамі Савецкага Саюза і народамі Гвінеі, Конга і Малі!

32. Гарачае прывітанне вялікаму індыйскаму народу! Няхай развіваецца і мацнее дружба і супрацоўніцтва паміж народамі Савецкага Саюза і Індыі!

33. Гарачае прывітанне пакістанскаму народу! Няхай мацнеюць і развіваюцца сяброўскія, добрасуседскія адносіны паміж Пакістанам і Савецкім Саюзам!

34. Гарачае прывітанне інданезійскаму народу! Няхай развіваецца і мацнее дружба і супрацоўніцтва паміж народамі Савецкага Саюза і Інданезіі!

35. Гарачае прывітанне мужнаму народу Паўднёвага В'етнама, які вядзе гераічную барацьбу супраць узброенай інтэрвенцыі амерыканскага імперыялізму і прадажнага антынароднага рэжыму, за свабоду і нацыянальную незалежнасць, за аб'яднанне сваёй радзімы на дэмакратычных асновах!

36. Гарачае прывітанне мужнаму народу Паўднёвай Карэі, які змагаецца за вывад амерыканскіх войск, за мірнае ўз'яднанне сваёй радзімы!

37. Гарачае прывітанне народам Камбоджы, Лаоса, Непала і Цэйлона, якія змагаюцца за мір і ўмацаванне нацыянальнай незалежнасці сваіх краін!

38. Гарачае прывітанне афганскаму народу! Няхай мацнеюць і развіваюцца сяброўскія, добрасуседскія адносіны паміж Савецкім Саюзам і Афганістанам!

39. Гарачае прывітанне народам арабскіх краін, якія змагаюцца за поўную ліквідацыю каланіялізму, умацаванне сваёй незалежнасці і сацыяльны прагрэс!

40. Гарачае прывітанне народам Паўднёвай Аравіі, якія вядуць гераічную барацьбу супраць імперыялізму, за свабоду і незалежнасць!

41. Гарачае прывітанне народам афрыканскіх дзяржаў, якія змагаюцца супраць каланіялізму і імперыялізму, за ўмацаванне сваёй незалежнасці, за развіццё нацыянальнай эканомікі і культуры!

42. Гарачае прывітанне народам Анголы, Мазамбіка, «Партугальскай» Гвінеі, Паўднёвай Радэзіі і Паўднёвай Афрыкі, якія вядуць гераічную барацьбу супраць імперыялізму і расізму, за свабоду і незалежнасць!

43. Гарачае прывітанне народам Лацінскай Амерыкі, якія змагаюцца супраць імперыялізму, за поўную незалежнасць сваіх краін!

44. Сяброўскае прывітанне народу Францыі! Няхай мацнее і развіваецца традыцыйная дружба савецкага і французскага народаў у інтарэсах усеагульнага міру і еўрапейскай бяспекі!

45. Сяброўскае прывітанне народу Велікабрытаніі! Няхай развіваецца і мацнее супрацоўніцтва паміж народамі Велікабрытаніі і Савецкага Саюза ў барацьбе супраць ваеннай пагрозы, у інтарэсах мірнага развіцця Еўропы і забеспячэння міру ва ўсім свеце!

46. Сяброўскае прывітанне амерыканскаму народу! Няхай шырыцца супрацоўніцтва паміж народамі Злучаных Штатаў Амерыкі і Савецкага Саюза з мэтай прадухілення сусветнай вайны, у імя захавання міру!

47. Няхай развіваюцца і мацнеюць дружалюбныя адносіны паміж савецкім народам і народамі Італіі і Грэцыі!

48. Няхай развіваюцца і мацнеюць добрасуседскія адносіны паміж савецкім народам і народамі Ірана і Турцыі!

49. Гарачае прывітанне працоўным і ўсім прагрэсіўным сілам Федэратыўнай Рэспублікі Германіі, якія змагаюцца супраць мілітарызму і адраджэння фашызму!

50. Гарачае прывітанне гераічнаму іспанскаму народу, які змагаецца за ліквідацыю фашысцкай дыктатуры і ўстанаўленне дэмакратычнага ладу!

51. Гарачае прывітанне народу Партугаліі, які вядзе мужную барацьбу за свабоду, супраць фашысцкага рэжыму!

52. Няхай жыве дружба і супрацоўніцтва паміж народамі Савецкага Саюза, Аўстрыі і Швецыі!

53. Гарачае прывітанне народу Фінляндыі! Няхай мацнеюць і развіваюцца сяброўскія, добрасуседскія адносіны паміж народамі Савецкага Саюза і Фінляндскай рэспублікі!

54. Няхай развіваюцца і мацнеюць дружалюбныя адносіны паміж савецкім народам і народамі Бельгіі, Галандыі, Даніі, Ісландыі, Нарвегіі!

55. Гарачае прывітанне японскаму народу, які змагаецца за поўную незалежнасць сваёй краіны, супраць амерыканскіх ваенных баз! Няхай развіваюцца і мацнеюць дружалюбныя адносіны паміж народамі Савецкага Саюза і Японіі!

56. Няхай жыве ленінская міралюбівая знешняя палітыка Савецкага Саюза!

57. Савецкія воіны! Свята захоўвайце і памнажайце гераічныя традыцыі Савецкай Арміі і Флоту, дабівайцеся новых поспехаў у баявой і палітычнай вучобе, умацоўвайце воінскую дысцыпліну, будзьце заўсёды гатовы сакрушыць любога агрэсара!

Няхай жывуць авеяныя славай перамог доблесныя Савецкія Узброеныя Сілы!

58. Няхай мацнее і працвітае саюз рабочага класа і калгаснага сялянства — непарушная аснова Савецкай Сацыялістычнай дзяржавы!

59. Няхай вечна жыве і працвітае непарушнае адзінства і брацкая дружба народаў СССР!

60. Слава калектывам і ўдарнікам, якія змагаюцца за камуністычныя адносіны да працы! Слава ўсім перадавікам і наватарам вытворчасці!

61. Работнікі прамысловасці і транспарту! Змагайцеся за паспяховае ажыццяўленне рашэнняў XXIII з'езда КПСС, заданняў пяцігадовага плана па далейшаму развіццю сацыялістычнай прамысловасці і транспарту!

62. Работнікі прамысловасці, будаўніцтва і транспарту! Павышайце эфектыўнасць грамадскай вытворчасці, лепш выкарыстоўвайце капітальныя ўкладанні і асноўныя фонды, хутчэй асвойвайце новыя магутнасці!

63. Работнікі прамысловасці, будаўніцтва і транспарту! Умацоўвайце тэхналагічную і вытворчую дысцыпліну, развівайце гаспадарчы разлік, павышайце рэнтабельнасць вытворчасці!

64. Працоўныя Савецкага Саюза! Павышайце прадукцыйнасць працы, зніжайце сабекошт, змагайцеся за паляпшэнне якасці прадукцыі!

65. Працоўныя Савецкага Саюза! Дабівайцеся эканомнага выдаткавання матэрыяльных рэсурсаў і дзяржаўных сродкаў! Змагайцеся з безгаспадарчасцю, празмернасцямі і марнатраўствам!

66. Работнікі прамысловасці, будаўніцтва і транспарту! Ажыццяўляйце комплексную механізацыю і аўтаматызацыю, настойліва ўкараняйце ў вытворчасць дасягненні навукі, тэхнікі і перадавы вопыт! Шырэй выкарыстоўвайце метады навуковай арганізацыі працы!

67. Савецкія металургі і гарнякі! Павялічвайце здабычу руды, вытворчасць чыгуну, сталі, пракату, труб, каляровых і рэдкіх металаў! Паляпшайце якасць металу!

68. Савецкія энергетыкі, будаўнікі і мантажнікі электрастанцый і электрасетак! Забяспечвайце апярэджваючыя тэмпы развіцця энергетыкі, зніжайце кошт будаўніцтва і эксплуатацыі энергасістэм!

69. Работнікі машынабудавання і прыборабудавання! Аснашчайце народную гаспадарку найноўшымі, эканамічнымі і надзейнымі машынамі, прыборамі, сродкамі механізацыі і аўтаматызацыі!

70. Работнікі вугальнай прамысловасці! Павялічвайце здабычу вугалю, зніжайце яго сабекошт! Лепш выкарыстоўвайце горную тэхніку!

(Заканчэнне на 4-й стар.).

Ахвотна знаёмім чытача са старшай апаратчыцай з Гродзенскага азотнатукавага завода Надзяй Куліковай. Дзяўчына прыехала ў Гродна з далёкага Урала пасля заканчэння хіміка-тэхналагічнага тэхнікума. Зараз яе змена — адна з перадавых у цэху аміяку.

Фота Ю. ІВАНОВА.

ДЭКАДА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА ВА УЗБЕКІСТАНЕ

САЛОМ, СЯБРЫ!

Узбекістан — Беларусь... Толькі калі паездзіш па краіне, пераканаешся, якая моцная звязвае нас дружба, колькі верных у нас сяброў.

Нам ніколі не забыць, што ў цяжкія гады вайны на ўзбекскай зямлі знайшоў сабе прытулак Якуб Колас. Адна з вуліц Ташкента носіць імя беларускага песняра. А ў Беларусі ёсць вёска Тапывалдыеўка, названая так у гонар выдатнага сына ўзбекскага народа, Героя Савецкага Саюза Мамадалі Тапывалдыева.

Вам раскажуць, колькі мінскіх самазвалаў працуе на будаўніцтве Чарвакскай ГЭС, якія сувязі ўстанавіліся паміж Узбекскім трактарозборачным і Мінскім трактарным, «Узбексельмашам» і мінскім «Ударнікам», што адгружае Узбекістан у Беларусь, а Беларусь — Узбекістану.

Ёсць і сувязі больш трывалыя — сувязі духоўныя. Пазаўчора ў ташкенцкім Палацы мастацтва, які змяшчае 2 300 гледачоў, адбылося ўрачыстае адкрыццё Дэкады беларускай літаратуры і мастацтва. З прамовамі выступілі першы сакратар ЦК Кампартыі Узбекістана Ш. Рашыдаў, народная паэтэса Узбекістана Зульфія, народны паэт Беларусі П. Броўка, сакратар ЦК Кампартыі Беларусі С. Пілатовіч.

У гэты ж дзень беларускія пісьменнікі прысутнічалі на адкрыцці выстаўкі беларускай літаратуры ў Дзяржаўнай бібліятэцы імя Алішэра Наваі, на кніжным кірмашы, дзе прадаваліся беларускія кнігі.

Учора адбылося адкрыццё выстаўкі твораў беларускіх мастакоў, фестывалю беларускіх фільмаў. Беларускія кінематаграфісты наведалі Саюз работнікаў кінематаграфіі Узбекістана, пазнаёміліся з новай работай «Узбекфільма» — кінакарцінай «Народжаны ў навальніцу».

У канцэртнай зале імя Свярдлова адбылося ўрачыстае адкрыццё літаратурнай часткі Дэкады. Вечар беларускай літаратуры трансліраваўся Узбекскім радыё і тэлебачаннем.

Народны артыст БССР І. Сарокін учора выступіў у спектаклі ўзбекскага тэатра оперы і балета «Князь Ігар». У вялікай зале кансерваторыі далі канцэрт народныя артысты БССР Т. Шымко і В. Чарнабаеў, у тэатры эстрады — група з удзелам заслужанага артыста БССР М. Шышкіна. Чытальнік С. Сокалаў выступіў у канцэртнай зале акруговага Дома афіцэраў.

Канцэрты беларускіх артыстаў адбыліся таксама ў Самаркандзе, Чырчыку, Алмалыку, Наваі, Фергане. Творчыя групы работнікаў беларускай літаратуры і мастацтва выступілі перад рабочымі Ташкенцкага тэкстыльнага камбіната, электралямпавага завода, завода «Узбексельмаш» і іншых прадпрыемстваў.

Сёння ўдзельнікі Дэкады групамі выязджаюць у вобласці рэспублікі.

М. МАРЦІНКОЎСКІ,
спец. кар. «Літаратуры і мастацтва».

ВЫСОКАЯ ЎЗНАГАРОДА

Указамі Прэз'дыума Вярхоўнага Савета РСФСР ад 11 красавіка за высокае выканаўчае майстэрства і паспяховае выступленне на фестывалі беларускага мастацтва ў РСФСР узнагароджаны Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета РСФСР: Дзяржаўны сімфанічны аркестр Беларускай ССР; Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла Беларускай ССР; Дзяржаўны ансамбль танца Беларускай ССР; Дзяржаўны марсдны аркестр Беларускай ССР; Дзяржаўны народны хор Беларускай ССР.

За актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзенні фестывалю беларускага мастацтва ў РСФСР узнагароджаны Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета РСФСР:

Клімаў І. Ф. — намеснік Старшыні Савета Міністраў Беларускай ССР; Марцалеў С. В. — загадчык аддзела культуры ЦК КП Беларусі; Мінковіч М. А. — міністр культуры Беларускай ССР; Палівода І. П. — начальнік Упраўлення па справах мастацтваў Міністэрства культуры Беларускай ССР; Пілатовіч С. А. — сакратар ЦК КП Беларусі.

За актыўны ўдзел у фестывалі беларускага мастацтва ў РСФСР і дасягнутыя творчыя поспехі ўзнагароджаны Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета РСФСР: Абеліёвіч Л. М. — кампазітар; Алоўнікаў У. У. — кампазітар; Апанасенка А. Р. — мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага ансамбля танца Беларускай ССР; Бабій З. І. — саліст Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларускай ССР; Вембель А. А. — мастак; Грамыка В. А. — мастак; Жыновіч І. І. — мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага народнага аркестра Беларускай ССР; Каландзёнак А. І. — дырэктар Беларускай дзяржаўнай філармоніі; Камінскі Д. Р. — старшыня праўлення Саюза кампазітараў Беларускай ССР; Карзянкова А. А. — салістка Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларускай ССР; Катаеў В. В. — галоўны дырыжор Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра Беларускай ССР; Міронаў В. П. — саліст Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларускай ССР; Ніжнікава Т. М. — салістка Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларускай ССР; Савельева І. М. — салістка Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларускай ССР; Сарокін І. Д. — саліст Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларускай ССР; Семянякa Ю. У. — кампазітар; Стальмашонак У. І. — старшыня праўлення Саюза мастакоў Беларускай ССР; Талкачоў С. Л. — канцэртмайстар; Ткачэнка Н. А. — салістка Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларускай ССР; Цітовіч Г. І. — мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага народнага хору Беларускай ССР; Чамадураў Я. Р. — галоўны мастак фестывалю; Шымко Т. І. — салістка Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларускай ССР; Шырма Р. Р. — мастацкі кіраўнік Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы БССР.

ІСЦІ Ў НАГУ З ЧАСАМ

З высокай трыбуны XXIII з'езда роднай Камуністычнай партыі былі пільна і клапатліва агледжаны ўсе бакі нашага жыцця, усе нашы поспехі і планы. З вышыні нашых дасягненняў, у святле велічных перспектыў сур'ёзна, па-дзелавому гаварылася на з'ездзе і пра стан савецкай літаратуры і мастацтва.

Наш мудры настаўнік, стваральнік першай у свеце дзяржавы рабочых і сялян Уладзімір Ільіч Ленін казаў, што «літаратурная справа павінна стаць часткаю агульнапралетарскай справы». І нам радасна зазначыць, што ўсе савецкія літаратары заўсёды лічылі і лічаць сваю працу неадрыўнай часткай вялікай справы працоўнага народа, справы Камуністычнай партыі. Народжаная Вялікім Кастрычнікам савецкая літаратура на ўсіх этапах свайго развіцця свядома і да канца служыла і служыць высокім ідэалам чалавека новага грамадства. У агні грамадзянскай вайны, на рыштаваннях першых пяцігодак, у полымі Вялікай Айчыннай вайны яна сталела і адточвала сваё майстэрства, заваёўвала аўтарытэт і славу ва ўсім свеце. Разам з гранатамі і патронамі ішло ў атаку з фашызмам слова паэта. Разам з кельмай бралі будаўнікі на рыштаванні любімыя кнігі. Савецкі пісьменнік і савецкі чытач заўсёды разумелі і разумеюць адзін аднаго, бо іх аб'ядноўвае адзінства мэты, адзінства ідэалаў. Л. І. Брэжнеў у дакладзе на XXIII з'ездзе падкрэсліў: «Залог паспяховага развіцця савецкай культуры мы бачым у тым, што наша творчая інтэлігенцыя ў сваёй рабоце кіруецца тымі ж мэтамі, тымі ж задачамі, што і ўвесь савецкі народ, яго Камуністычная партыя».

Сувязь з жыццём, народнасць і партыйнасць — вызначальныя рысы нашага мастацтва. Таму так хутка заваёўваюць любоў і прызнанне менавіта тыя творы літаратуры і мастацтва, якія закранаюць важныя і галоўныя праблемы часу, якія ярка і дакладна паказваюць галоўнага героя — чалавека-творцу, чалавека-барацьбіта. Такія творы ёсць у актыве савецкіх пісьменнікаў, кінематаграфістаў, мастакоў, кампазітараў. На іх выхоўваюцца людзі заўтрашняга дня, сённяшнія юнакі і дзяўчаты, якія будуць жыць пры камунізме. Іх з захапленнем прымаюць нашы сябры ва ўсім свеце.

На з'ездзе партыі, як адна з вялікіх заслуг творчай інтэлігенцыі, адзначалася ўвага яе да сучаснасці, да надзённых праблем камуністычнага будаўніцтва ў нашай краіне. У нагу з часам ідуць лепшыя нашы пісьменнікі, скульптары, дзеячы тэатра і кіно. Яны імкнуцца глыбока асэнсаваць і ярка адлюстраваць усю велічэ сённяшняга дня, раскрыць небывалую прыгажосць душы і спраў нашага сучасніка. Усё гэта ведае і любіць наш народ. Але, на жаль, шмат цікавага, вартага самага высокага слова, застаецца па-за ўвагай майстроў літаратуры, па-за ўвагай і нашых кінематаграфістаў, і нашых мастакоў. Часам бывае яшчэ і так, што другараднае прымаецца за галоўнае, прыватнае выдаецца за агульнае — і тым самым няправільна падаецца карціна нашага жыцця.

Гаворка пра літаратуру, мастацтва на XXIII з'ездзе КПСС была шырокая і строгая. Аддаючы належнае агульнавядомым і агульнапрызнаным поспехам майстроў літаратуры і мастацтва, дэлегаты з'езда справядліва ўказвалі і на недахопы і пралікі ў творчасці пісьменнікаў, кампазітараў, кінематаграфістаў. Крытыка гэтая была дзелавая і канкрэтная і зыходзіла з вялікіх задач, якія стаяць перад творчай інтэлігенцыяй у справе выхавання чалавека камуністычнага грамадства.

Яшчэ сустракаюцца сярод літаратараў людзі, якія ў сваіх творах замест глыбокага і ўсебаковага аналізу нашага жыцця, нашага мінулага кідаюцца даследаваць толькі адмоўнае, стараюцца асаблівую ўвагу ўдзяляць цяжкасцям, забываючы пра поспехі і дасягненні. У сваім выступленні на з'ездзе першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі П. М. Машэраў справядліва здзіўляўся, «з якой паспешлівасцю і лёгкасцю часам слабыя ў ідэйных і мастацкіх адносінах, а іншы раз проста шкодныя творы публікуюцца на старонках папулярных часопісаў і выпускаюцца асобнымі выданнямі».

Не заўсёды яшчэ літаратурная грамадскасць своечасова дае адпор шкодным тэндэнцыям у творчасці некаторых аўтараў, не заўсёды прынцыпова і строга ставіцца да паяўлення малазмястоўных кніг. Відаць, яшчэ не ўсе літаратары выпрацавалі ў сабе пачуццё адказнасці за кожнае слова, за кожны свой твор. А народу ў барацьбе за новае грамадства патрэбна слова прадуманае, слова-барацьбіт, слова-агітатар.

Выдатны пісьменнік нашага часу Міхаіл Шолахаў з трыбуны партыйнага з'езда заявіў: «Месца пісьменніка ў грамадскім жыцці мы, савецкія літаратары, вызначаем як камуністы, як сыны нашай вялікай Радзімы, як грамадзяне краіны, якая будуе камуністычнае грамадства, як выразнікі рэвалюцыйна-гуманістычных поглядаў партыі, народа, савецкага чалавека». Гэтая пазіцыя была і ёсць асноўнай у працы кожнага савецкага літаратара, у якім бы жанры ён ні выступаў. Грамадзянская адказнасць перад часам, перад народам кіруе ім, калі ён бярэцца за пяро, каб сказаць чэснае ўсхваляванае слова аб усім, што прайшло праз яго сэрца, што падказана гістарычным ходам жыцця.

Савецкая літаратура — літаратура сацыялістычнага рэалізму. І яе галоўны пафас — пафас сцвярджэння, сцвярджэння новага ладу жыцця, сцвярджэння новага чалавека. Народжаная самай стваральнай рэвалюцыяй на зямлі, яна заклікана несці вякам праўдзівае слова пра вялікі подзвіг працоўнага люду, які першы ў свеце стварыў краіну рабочых і сялян. Не абыходзячы складанасць барацьбы, не замоўчваючы цяжкасці, яна павінна паказаць буйучым пакаленням шлях мужнасці і самаахвярнасці, шлях пошукаў і перамог, які прайшоў савецкі чалавек. І недаравальна, калі сёй-той пад выглядам крытыкі недахопаў спрабуе заняцца ачарніцельствам, спрабуе ўсумніцца ў асновах нашай маралі. Ніколі нельга забываць, што ідзе вострая ідэалагічная барацьба двух светаў, і літаратура не можа стаяць у баку ад гэтай барацьбы. Абавязак кожнага савецкага літаратара — сваёй творчасцю даваць рашучы адпор варожай ідэалогіі, быць у першых радах барацьбітоў за камуністычнае заўтра. Сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў СССР Г. М. Маркаў на з'ездзе адзначаў: «Партыя падтрымлівала і падтрымлівае пісьменнікаў, якія востра бачаць усё тое, што тармозіць наш рух наперад, што перашкаджае нам хутчэй і лепш ажыццяўляць вялікія мэты. Але крытычны пафас сапраўднага савецкага мастака заўсёды бывае стваральным па сэнсу, яго крытыка бывае прадыктавана страсцю змагара».

XXIII з'езд партыі не толькі звяроза і строга ацаніў зробленае. Ён смела і далёка зазірнуў наперад. Прыняты Дырэктывы па новай пяцігодцы, накрэслена вялікая праграма далейшага руху да камунізма. Перад пісьменнікамі і работнікамі мастацтва адкрыты новыя далягляды. Патрэбны новыя песні, новыя вершы, новыя фільмы, новыя палотны. Трэба ісці ў нагу з часам, трэба не адставаць ад свайго героя — чалавека-творцы, чалавека-змагара. І — памятаць, што з кожным годам усё больш патрабавальным, усё больш падрыхтаваным робіцца наш чытач, слухач, глядач...

Увесь савецкі народ, усё прагрэсіўнае чалавецтва рыхтуецца да слаўных дат — 50-годдзя Вялікага Кастрычніка і 100-годдзя з дня нараджэння Ул. І. Леніна. Важкае слова ў гэты час павінна сказаць наша творчая інтэлігенцыя. Трэба ўпісаць новыя яркія старонкі ў Ленініяну, трэба дастойна ўславіць учарашні і сённяшні дзень Савецкай краіны. Рабочы клас, калгаснае сялянства чакаюць новых яркіх твораў пра іх працу, пра іх гераізм. Наша моладзь хоча, каб побач з вобразамі Карчагіна і Марэсьева сталі вобразы сучаснікаў, вартыя пераймання. Адным словам, у работнікаў літаратуры і мастацтва наперадзе шмат работы...

«Партыя чакае ад творчых работнікаў новых значных твораў, якія захаплялі б глыбінёй і праўдзівасцю адлюстравання жыцця, сілай ідэйнага пафасу, высокім мастацкім майстэрствам, актыўна дапамагалі б фарміраванню духоўнага аблічча будаўніка камунізма, выхоўвалі ў савецкіх людзях высокія маральныя якасці, адданасць камуністычным ідэалам, пачуццё грамадзянскасці, савецкага патрыятызму і сацыялістычнага інтэрнацыяналізму». Так сказана ў Рэзалюцыі XXIII з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза па Справаздачнаму дакладу Цэнтральнага Камітэта КПСС. І няма сумнення, што пісьменнікі, работнікі мастацтва, усёй душою ўспрыняўшы словы партыі, будуць крочыць у нагу з часам, створаць новыя творы, вартыя нашага слаўнага сучасніка.

НЕЗАБЫЎНЫ МАРШРУТ

І. ПАЛІВОДА,
начальнік Упраўлення па справах мастацтва Міністэрства культуры БССР

Фестывальны поезд «Дружба» праклаў незабыўны маршрут па зямлі Расіі. Шмат слаўных старонак у гісторыі культурных сувязей нашых народаў, але фестываль 1966 года несумненна з'явіцца адной з самых яркіх.

Сорак дзён, праведзеных намі на легендарнай зямлі Сібіры і Урала, назаўсёды застануцца ў памяці. Звыш 500 канцэртаў і творчых сустрэч, выстаўкі работ беларускіх мастакоў, паказ лепшых фільмаў — усё гэта даволі поўна адлюстравала дасягненні беларускага мастацтва напярэдадні слаўнага 50-годдзя Савецкай улады. Нашы гасцінныя гаспадары выявілі вялізарную цікавасць да жыцця беларускага народа і яго культуры. Даволі сказаць, што ўсе білеты на паказы беларускіх фільмаў былі раскуплены задоўга да пачатку фестывалю. З першых дзён нашых выступленняў у Расіі стала ясна, што фестываль перарастае звычайныя рамкі, што ён ператвараецца ў вялікае ўрачыстае свята, у незабыўную падзею грамадскага жыцця.

Сібіракі і ўральцы прымалі нас, як родных і блізкіх. Яны шырока расчынілі перад намі дзверы свайго дома, паказалі з гордасцю свае здабыткі. Мы ўбачылі гіганцкія заводы і шахты, калгасы і саўгасы, новыя універсітэты, тэатры, музеі. Сібір і Урал паўсталі перад намі, пераўтвораныя нястомнай працай савецкіх людзей, ва ўсёй сваёй прыгажосці.

Каб цалкам ацаніць усё, што адбылося на фестывалі, спатрэбіцца час. Але ўжо сёння можна падвесці некаторыя вынікі, бо для беларускага мастацтва фестываль з'явіўся своеасаблівай вяхой, якая дапаможа нам вызначыць кірунак далейшай работы калектываў, формы іх творчай дзейнасці.

Фестываль выклікаў вялікую цікавасць да беларускага мастацтва з боку філармоній і канцэртных арганізацый Расіі, прычым, не толькі тых абласцей, дзе мы выступалі. Попыт на беларускіх выканаўцаў прыкметна ўзрос. Мы ўжо маем шэраг заявак і прапаноў на арганізацыю больш працяглых гастроляў нашых калектываў. Бясспрэчна, што далей такіх заявак будзе яшчэ больш. У пашырэнні культурнага абмену мы бачым адзін з важных вынікаў фестывалю. Услед за Расіяй беларускіх артыстаў запрасіў да сябе Узбекістан. Увосень намячаюцца гастролі нашых калектываў за мяжой. Беларускае мастацтва ўпэўнена выйшла на ўсесаюзную і міжнародную арэну, а гэта абавязвае нас яшчэ больш уважліва паставіцца да вывучэння вопыту такой вялікай гастрольнай паездкі, якой быў фестываль у Расіі.

Трэба адзначыць перш за ўсё адно: усе нашы калектывы і салісты, а таксама творчыя кампазітарскія групы з гонарам вытрымалі складанае выпрабаванне. Цяпер, калі клопаты засталіся ззаду, можна ўспомніць, з якім хваляваннем пачынаў свае выступленні ў Новасібірску і Свярдлоўску Дзяржаўны сімфанічны аркестр БССР. Справа ў тым, што ў гэтых гарадах ёсць свае сімфанічныя аркестры, шырока вядомыя ў краіне. Яны рэгулярна выязджаюць у Ленінград, Маскву і іншыя гарады, і прафесіянальны ўзровень гэтых калектываў даволі высокі. Аднак, у сяброўскім спаборніцтве з новасібірцамі і свердлаўчанамі Беларускі сімфанічны аркестр не схібіў. Вельмі добра былі прыняты публікай новыя творы беларускіх кампазітараў, а Шостую сімфонію Шастаковіча і некаторыя іншыя нумары праграмы давялося бісіраваць. Тут, у Свярдлоўску, узнікла размова аб арганізацыі абменных гастроляў сімфанічных аркестраў. Гэтую прапанову трэба ажыццявіць, знайсці магчымасці рэгулярна выязджаць нашаму сімфанічнаму аркестру за межы рэспублікі.

З вялікім поспехам праходзяць усюды канцэрты Дзяржаўнага аркестра народных інструментаў з удзелам Зіновія Бабія. Поспех выпаў перш за ўсё на долю З. Бабія. Гэты выдатны спявак варты захаплення. Але і цымбальны аркестр прымала публіка вельмі цёпла, некаторыя нумары гучалі проста выдатна. І тым не менш, задумваючыся аб далейшым лёсе гэтага унікальнага калектыву, пытаеш сябе, ці не спыніўся ён у сваім росце? Ці не выпрацаваў ужо нейкі стандарт, па якім «робяцца» ўверцюры, фантазіі, балады? Ці не зашмат неахайнасці ў ігры музыкантаў? Аддаючы належнае ролі калектыву ў развіцці і прапагандзе беларускай музыкі, памятаючы пра вялікі поспех у дні фестывалю, мы, тым не менш, павінны гэтыя пытанні паставіць.

Поспех канцэртаў Дзяржаўнага ансамбля танца БССР прэса звычайна адзначала як трыумфальны. Так яно і было: бясконцае скандаванне залы, стомленыя, але шчаслівыя выканаўцы, стыхійныя мітынгі ў зале і на сцэне з кветкамі (зімой у Сібіры!), памятныя падарункі. Ансамбль атрымаў запрашэнне на больш працяглыя гастролі ў тых абласцях, дзе выступаў. Відаць, так будзе і далей. Але мы не можам не заўважыць і іншага. Магчыма, за час частых і працяглых гастрольных паездак, магчыма, па іншых прычынах, але за апошнія паўтара—два гады ў ансамблі не з'явілася новых значных работ, асабліва на беларускія тэмы. Абнаўленне праграмы адбываецца занадта марудна, а без гэтага прафесіянальнаму калектыву проста немагчыма жыць.

Хацелася б яшчэ ўспомніць аб праблемах, якія існуюць у Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэле, у Народным хоры БССР. Усе гэтыя «вытворчыя пытанні» паўсталі перад намі ва ўсёй вастрыні і ў час фестывалю, і трэба, каб фестывальны ўздым не адсунуў іх на далёкі план для саміх кіраўнікоў калектыву.

Работнікі беларускага мастацтва працавалі ў час фестывалю з поўнай нагрузкай, самааддана, з добрымі вынікамі. Вялікая падрыхтоўчая работа не прапала марна: усё было дакладна прадумана, добра арганізавана. У гэтым вялікая заслуга арганізацыйных камітэтаў, якія дакладна спланавалі і забяспечылі работу калектыву большым у 500 чалавек.

Бясспрэчна, што і гэты вопыт арганізацыі фестывалю ў прадбачанні новых паездак варты самага ўважлівага вывучэння.

Што можна сказаць у заключэнне?

Фестываль дасягнуў сваёй галоўнай мэты. У нас не толькі адбылося знаёмства са шматмільённай аўдыторыяй гледачоў, не толькі ўмацавалася дружба паміж работнікамі мастацтва, але і з'явіліся новыя стымулы для далейшага больш плённага супрацоўніцтва.

Яшчэ ніколі праца нашых творчых работнікаў так шырока не абмяркоўвалася, яшчэ ніколі такімі шматлікімі не былі нашы аўдыторыі. Вынікі фестывалю, вядома, не вызначаюцца толькі лічбамі. Не можа не мець значэння той факт, што ў нас было так многа зацікаўленых і добразычлівых крытыкаў, што свае думкі аб канцэртах выказвалі артыстам тысячы рабочых, студэнтаў, дзеячоў мастацтва, літаратараў. Шчырае ім дзякуй ад работнікаў беларускага мастацтва!

Кожны ўдзельнік фестывалю вязе ў сваім сэрцы цепліню Расіі. Хай памяць аб сустрэчах паслужыць асновай новых творчых здабыткаў нашых дзеячоў мастацтва. У гэтым вялікі сэнс свята, якое адбылося.

Людміла Лайкоўская працуе тэлефаністкай у Ашмянах. Яна актыўная ўдзельніца самадзейнасці. У спектаклі народнага тэатра «Вяселле ў Малінаўцы» Людміла выконвае галоўную ролю Ярынкі.

Фота УЛ. КРУКА.

АБМЕРКАВАННЕ КНІГІ ПАЭТА

На чарговым пасяджэнні літаратурнага аб'яднання пры абласной газеце «Магілёўская праўда» быў абмеркаваны зборнік вершаў А. Пысіна «Мае мерыдыяны»

— Паэт прайшоў нялёгкі жыццёвы шлях. У яго ёсць і будзе заўсёды што сказаць людзям, — гаворыць В. Матэвушаў. — У Пысіна яркі, усхваляваны паэтычны голас. Зборнік яго вершаў — прыкметная з'ява ў беларускай паэзіі за мінулы год.

Рэдактар Брахаўскай раённай газеты Р. Барысаў адзначыў, што ў свае вершы А. Пысін уклаў сэрца, душу, песню народную. Яны зразумелыя людзям усіх пакаленняў.

У абмеркаванні кнігі прынялі ўдзел журналіст Е. Карклін, маладыя літаратары А. Канапелька, Н. Зверава, студэнты, чытачы.

А. САЛТУК.

«ПАЎЛІНКА» на студэнцкай сцэне

Студэнты Мазырскага педагагічнага інстытута вырашылі паставіць камедыю Янкі Купалы «Паўлінка». За пастаноўку ўзяўся Яўген Дашкевіч — удзельнік Мазырскага народнага тэатра.

Нядаўна ў актавай зале інстытута сабраліся студэнты і выкладчыкі. Аматараў сустрэцца з «Паўлінкай» было больш, чым месц у зале. Многія стаялі.

Адкрылася заслона, і з першых хвілін камедыя захапіла гледачоў. Яны ўважліва сачылі за ігрой самадзейных анцёраў.

А. БАРОЎСКІ.

ТРАДЫЦЫЙНАЯ ДРУЖБА

Даўняя дружба звязвае педагогаў і студэнтаў Мінскай кансерваторыі і спецыяльнай музычнай школы з Гомельскай музычнай школай імя Чайкоўскага. Мінчане некалькі разоў за апошнія гады прыязджалі ў Гомель. Каб памагчы сваім калегам асвоіць новае ў методыцы выкладання, праводзілі тут семінары і паказальныя ўрокі. Выязджалі ў Мінск і гамяльчане — на занятках у кансерваторыі і школе-дзесяцігодцы яны ўзялі для сябе шмат карыснага.

Нядаўна група студэнтаў кансерваторыі і вучняў школы — выхаванцаў выкладчыцы І. Цвятаевай — выступілі ў Гомелі з вялікім канцэртам з твораў рускіх, савецкіх і зарубежных кампазітараў.

Канцэрт прайшоў з вялікім поспехам.

А. КУЛАГА.

ВЫСТАЎКА МАЛАДЫХ МАСТАКОЎ

У Віцебску адкрылася выстаўка работ маладых мастакоў, студэнтаў мастацка-графічнага факультэта Віцебскага педінстытута. На ёй паказана 150 работ. Асаблівую увагу прыцягваюць работы нядаўняга кранаўшчыка, а цяпер студэнта С. Кампанічэнкі «Брыганціна ўзнімае ветразі», «Стэп адступае», «Віцебская новабудоўля», у якіх паказаны гераічныя справы нашых сучаснікаў. Поўныя рамантыкі ілюстрацыі Л. Воранавай да аповесці А. Талстога «Аэліта» і твораў іншых савецкіх пісьменнікаў.

Ю. ДОКТАРАЎ.

ШТОДЗЁННА ДБАЦЬ ПРА ТВОРЧАСЦЬ

З ПЛЕНУМА ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА МАСТАКОЎ БЕЛАРУСІ

Сёння ў мастакоў Савецкай Беларусі адзін галоўны клопат — дастойна падрыхтавацца да рэспубліканскіх і ўсесаюзных выставак, прысвечаных 50-годдзю Вялікага Кастрычніка і 100-годдзю з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна. Аб гэтай падрыхтоўцы вялася гаворка на пленуме праўлення Саюза мастакоў БССР 13 красавіка.

З дакладамі выступілі старшыня праўлення Саюза мастакоў БССР Ул. Стальмашонак, старшыня праўлення Мастацкага фонду БССР П. Масленікаў, старшыня рэвізійнай камісіі Саюза мастакоў БССР Ул. Пасюкевіч.

Ул. Стальмашонак прааналізаваў работу творчага калектыву за час, што прайшоў пасля апошняга рэспубліканскага з'езда мастакоў, праінфармаваў прысутных аб плане мерапрыемстваў на гэты год і падзяліўся думкамі ў сувязі з сакавіцкім пленумам Саюза мастакоў СССР. Ён вызначыў асноўныя кірункі, у якіх сёння ідзе работа Саюза мастакоў рэспублікі, і падкрэсліў неабходнасць узмацніць ідэйна-выхаваўчую работу ў калектыве ў святле рашэнняў XXIII з'езда КПСС. Затым Ул. Стальмашонак адзначыў павышэнне актыўнасці творчых секцый, якія сёння ўжо заклапочаны падрыхтоўкай да юбілейных выставак. Гаворачы аб прапагандзе выяўленчага мастацтва ў рэспубліцы, дакладчык звярнуў увагу на неабходнасць далейшага паляпшэння выставачнай работы. Многае ўжо робіцца ў гэтай галіне, але трэба яшчэ часцей і на больш высокім ідэйна-мастацкім узроўні наладжваць рабочыя, персанальныя, абменныя, групавыя выстаўкі, не кажучы ўжо аб справаздачных.

«Партыя — народ — камунізм» — такі будзе дэвіз усесаюзнай выстаўкі, прысвечанай юбілею Савецкай улады. Прадугледжваецца неабмежаваная разнастайнасць тэм, якія выражаюць мастакі ў сваіх новых творах. Ідэйна-тэматычны план падрыхтоўкі да юбілейных выставак, распрацаваны Саюзам мастакоў рэспублікі і Міністэрствам культуры БССР, таксама мае на ўвазе вялікую разнастайнасць тэм. На жаль, падкрэслівае дакладчык, яшчэ далёка не ўсе мастакі з поўнай адказнасцю ўзяліся за рэалізацыю гэтых планаў.

Далей дакладчык спыніўся на творчых пытаннях, звязаных з рашэннямі сакавіцкага пленума Саюза мастакоў СССР.

У нашым творчым калектыве, адзначае ён, мастакі прафесіянальна падрыхтаваны добра. Але, на вялікі жаль, яны пакуль што недастаткова ўважлівыя да жыцця, да сучаснасці. Пра гэта сведчыць хоць бы той факт, што на ўсесаюзную выстаўку «Мастацтва — дзецям» трапілі толькі дзве работы беларускіх мастакоў — «Мацярынства» Л. Шчэмелева, «Рыта і Андрэй» М. Савіцкага.

У нас яшчэ недастаткова ўвагі надаецца тэме працы. На ўсесаюзнай арэне ў гэтым плане добра зарэкамендавалі сябе ў апошні час толькі М. Данцыг і К. Касмачоў.

Характарызуючы становішча з выкананнем мастакамі задач, якія пастаўлены перад імі пастановай ЦК КПБ аб увекавечанні подзвігаў савецкіх людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны, а таксама гаворачы аб іншых аспектах манументальнай прапаганды, Ул. Стальмашонак падкрэслівае неабходнасць наладзіць больш цесныя творчыя сувязі з Саюзам архітэктараў БССР.

Як добры пачатак у рабоце з творчай моладдзю дакладчык ацэньвае абмеркаванне рэспубліканскай выстаўкі маладых мастакоў, якое адбылося нядаўна. Аб даверы да творчай моладзі сведчыць той факт, што каля палавіны дагавораў на новыя творы да юбілейных выставак заключана з маладымі мастакамі.

У аснове работы па падрыхтоўцы твораў да юбілейных выставак — тэматычная станковая карціна, манументальная скульптура, графічныя серыі. Многа дагавораў заключана з мастакамі-прыкладнікамі. Галоўнае, каб у новых творах адчуваўся пафас грамадзянскасці, каб высокай іх ідэі адпавядала высокае майстэрства.

Гаворачы аб тэарэтычным асвятленні творчых праблем, дакладчык падкрэслівае, што крытычная думка ў Саюзе мастакоў пакуль што не на патрэбным узроўні, секцыя крытыкі і мастацтвазнаўства недастаткова актыўна праяўляе сябе, каб спрыяць вырашэнню надзённых творчых пытанняў.

Па-ранейшаму бедна выглядае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва ў нашай рэспубліцы. Пра гэта гаварылася і на пленуме Саюза мастакоў СССР.

Дакладчык характарызаваў работу мастакоў абласных цэнтраў. У Гомелі ствараецца аддзяленне Саюза мастакоў. Добры калектыў мастакоў у Гродна. Досыць актыўна працуюць мастакі Віцебска, Магілёва, Брэста.

Ул. Стальмашонак спыніўся таксама на рабоце тэатральна-мастацкага інстытута, дзе, на яго думку, творчая практыка студэнтаў адарвана ад жыцця. Студэнты інстытута бываюць на практыцы ў аснoўным паблізу горада, у адных і тых жа мясцінах. А трэба, каб іх паездкі на практыку геаграфічна пашыраліся.

У заключэнне дакладчык падкрэслівае, што мастакі Савецкай Беларусі трывала займаюць рэалістычныя пазіцыі і здольны справіцца з задачамі, якія ставіць перад імі жыццё.

Старшыня праўлення Мастацкага фонду БССР П. Масленікаў інфармаваў прысутных аб становішчы з будаўніцтвам майстэрань, выставачнага павільёна, вытворчых карпусоў.

Асобна спыніўся дакладчык на неабходнасці ўзняць культуру афармленчых работ на прадпрыемствах Мастацкага фонду. Не толькі тэматычныя і станковыя творы павінны быць дасканалыя. Мы адказваем таксама за афармленне нашых населеных пунктаў. Кантроль за ўсімі афармленчымі работамі неабходна ўскласці на мастакоў.

Старшыня рэвізійнай камісіі Саюза мастакоў БССР Ул. Пасюкевіч праінфармаваў удзельнікаў пленума аб выкананні рашэнняў прэзідыума праўлення Саюза мастакоў БССР. Ён адзначыў, што некаторыя члены праўлення перагружаны работаю, а іншыя не працуюць зусім. Дрэнна працуе, не прымае ўдзелу ў абмеркаванні выставак крытычная секцыя. Нічога не робіць камісія па праверцы выставачнага фонду. Паводле меркаванняў рэвізійнай камісіі, работа прэзідыума праўлення зводзіцца нярэдка да пасіўнага праслухоўвання інфармацыі. Парушаюцца часам прынцыпы калегіяльнасці кіраўніцтва творчым саюзам.

У спрэчках, якія закранулі важныя моманты жыцця калектыву, выступіла больш дваццаці прамоўцаў.

Трывогай за становішча з выкананнем плана манументальнай прапаганды былі прасякнуты выступленні скульптараў Г. Мурамцава і П. Белавусава. Яны адзначалі, што многа часу патрачана на арганізацыйныя захады і таму цяпер неабходна працаваць як мага больш напружана.

На думку К. Касмачова, немагчыма рыхтавацца да юбілейных выставак без прынцыповай творчай размовы па галоўных праблемах выяўленчага мастацтва, якія сёння ставіць жыццё. Наспеў час на спецыяльным творчым сходзе пагаварыць аб праблемах нацыянальнай формы, аб праблемах наватарства. Прамоўца заклікаў да ўзмацнення прынцыпу калегіяльнасці ў кіраўніцтве Саюзам мастакоў.

Ул. Сухаверхаў таксама адзначыў, што неабходна больш гаварыць аб творчых праблемах, больш спрачацца. І ў гэтым сэнсе, на яго думку, пленум недастаткова падрыхтаваны.

Аб мастацтве плаката ў рэспубліцы гаварыў Л. Кроль. Ён выказаў нездавальненне з тае прычыны, што ні ў адным з трох дакладаў ні слова не было сказана аб плакаце.

Работу віцебскіх мастакоў характарызаваў у сваім выступленні А. Толкач. Віцебскія мастакі досыць актыўна рыхтуюцца да юбілейных выставак. У апошні час імі праведзена некалькі мастацкіх выставак. Адна з іх вось ужо шэсць месяцаў экспануецца ў розных населеных пунктах вобласці. У гонар XXIII з'езда КПСС адкрыта выстаўка маладых мастакоў Віцебшчыны.

— У нас, у Віцебску, — сказаў прамоўца, — дзевяць членаў Саюза мастакоў і сем кандыдатаў у члены саюза. Гэта наш актыў, вакол якога гуртуецца ўвесь калектыў мастакоў. У адной толькі Оршы працуюць 24 мастакі. Сямёра з іх — удзельнікі міжнародных выставак па прыкладному мастацтву. Мэтазгодна больш уважліва паставіцца да іх творчасці, паставіць пытанне аб прыёме некаторых з іх у саюз.

М. Шмакаў інфармаваў прысутных аб рабоце брэсцкага калектыву мастакоў. Ён адзначыў, што актыўна працуюць І. Фяцісаў, М. Чураба, Э. Куфко, М. Аўчыннікаў. Цяпер у Брэсце рыхтуецца некалькі выставак, у тым ліку выстаўка мастака В. Шыкіна, якая павінна неўзабаве адкрыцца на радзіме мастака — у адным з калгасаў Брэстчыны.

Аб тым, што заказы на стварэнне манументальных твораў павінны размяркоўвацца з улікам рэкамендацыі творчых секцый, гаварыў Г. Вашчанка. Мастацтвазнаўцы і крытыкі павінны больш актыўна абмяркоўваць гатовыя манументальныя творы. Прамоўца спыніўся таксама на пытаннях прапаганды мастацтва, востра крытыкаваў прадукцыю Мастацкага фонду. Добра, што ствараюцца серыі эстампаў, але не вельмі задавальняе ўзровень выканання іх. Па-ранейшаму няма ў салон-магазіне цікавага, арыгінальнага беларускага эстампа.

Л. Дробаў зазначыў, што многія члены секцыі крытыкі прынялі ўдзел у напісанні гісторыі беларускага выяўленчага мастацтва, якая выдаецца ў Маскве, а таксама рыхтуюць да друку на грамадскіх асновах першы выпуск перыядычнага зборніка, прысвечанага пытанням выяўленчага мастацтва. Адказваючы на крытычныя заўвагі ў адрас секцыі, прамоўца спасылаўся на тое, быццам бы творчая неактыўнасць членаў секцыі тлумачыцца тым, што, маўляў, у выдавецтве «Беларусь» і рэспубліканскіх перыядычных выданнях недастаткова прыхільна ставяцца да секцыі.

На пленуме выступілі таксама В. Сахненка, В. Гаўрылаў, І. Белановіч, І. Стаевіч, Ул. Вержбаловіч, І. Ізох, А. Малішэўскі, Р. Кудрэвіч і іншыя. Надаючы шмат увагі арганізацыйным пытанням, адзначаючы неабходнасць узмацнення калегіяльнасці ў арганізацыйнай рабоце саюза, прамоўцы зусім недастаткова гаварылі аб праблемах сённяшняга беларускага савецкага мастацтва, аб канкрэтных творчых пытаннях, у лепшым выпадку толькі называючы тыя ці іншыя творчыя праблемы, але не паглыбляючыся ў іх.

У заключным слове Ул. Стальмашонак падкрэсліў, што гэты пленум быў вельмі патрэбны і прайшоў пры значнай заклапочанасці станам выяўленчага мастацтва рэспублікі. Беларускія мастакі выканаюць пачэсныя задачы, якія перад імі ставяць наш сённяшні дзень, рашэнні XXIII з'езда КПСС.

У рабоце пленума прынялі ўдзел намеснік загадчыка аддзела культуры ЦК КПБ Я. Парватаў, намеснік міністра культуры БССР Ю. Міхневіч.

Ул. БОЙКА.

АДЗІНАДУШНАЕ АДАБРЭННЕ

14 красавіка ў Саюзе пісьменнікаў Беларусі адбыўся адкрыты партыйны сход. З дакладам «Рашэнні XXIII з'езда КПСС і задачы беларускай літаратуры» выступіў дэлегат з'езда старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Пятрусь Броўка. У спрэчках прынялі ўдзел М. Аляксееў, П. Пестрак, А. Савіцкі, С. Шушкевіч, А. Слесарэнка, І. Грамовіч, І. Дуброўскі.

Прысутныя адзінадушна ўхвалілі рашэнні XXIII з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і заклікалі ўсіх пісьменнікаў актыўна дапамагаць іх ажыццяўленню.

ПРАЦЯГ ГАВОРКІ

Гаворка, распачатая на мінулым пленуме Саюза пісьменнікаў аб паляпшэнні якасці падручнікаў літаратуры, атрымала працяг на сустрэчы групы пісьменнікаў з супрацоўнікамі Міністэрства асветы, выдавецтва «Народная асвета», інстытута педагогікі. У ёй прынялі ўдзел І. Мележ, Я. Брыль, А. Якімовіч, Э. Агняцвет і іншыя.

Намеснік міністра асветы Р. Сярноў запэўніў прысутных, што выказаныя прапановы і крытычныя заўвагі будуць сур'ёзна вывучаны і выкарыстаны ў рабоце над паляпшэннем падручнікаў роднага слова.

РАЗМОВА ПРА СУЧАСНУЮ ОПЕРУ

Лёс опернага жанру як аднаго з найбольш складаных і разам з тым любімых народам відаў мастацтва, пошукі новых шляхоў яго развіцця хвалююць у нашы дні ўсіх практыкаў і тэарэтыкаў савецкага опернага тэатра, усю музычную грамадскасць краіны.

З 2 па 10 красавіка ў Ленінградзе праходзіла Усесаюзная творчая канферэнцыя, спецыяльна прысвечаная праблемам развіцця савецкай оперы і яе ўвасабленню на сцэнах нашых тэатраў. Ад Беларусі ў рабоце гэтай канферэнцыі прынялі ўдзел старшыня прэзідыума Беларускага тэатральнага таварыства, народная артыстка СССР Л. Александроўская і дацэнт Беларускай кансерваторыі, музыказнаўца А. Ладыгіна. Нядаўна яны выступілі ў мінскім Доме мастацтва перад работнікамі Беларускага тэатра оперы і балета, кампазітарамі, пісьменнікамі - лібрэтыстамі, крытыкамі з інфармацыяй аб выніках ленінградскай канферэнцыі.

А. Ладыгіна даволі падрабязна расказала прысутным пра тыя актуальныя і жыццёва важныя праблемы опернага мастацтва, якія ўзніміліся ўдзельнікамі дыскусіі на гэтай канферэнцыі, падзялілася сваімі ўражаннямі аб праслуханых цалкам або ва ўрыўках некаторых новых савецкіх операх («Аптымістычная трагедыя» А. Холмінава, «Кастрычнік» В. Мурадэлі, «Два капітаны» Р. Шантыра і інш.).

На канферэнцыі адзначаліся, паводле слоў А. Ладыгінай, асобныя дасягненні савецкай оперы, але разам з тым многа гаварылася і пра яе недахопы. Большасць сучасных оперных твораў, у тым ліку творы беларускіх кампазітараў, маюць слабую, нядзейсную музычную драматургію, штампы ў лібрэта, нівеліраваную музычную мову. Востра абмяркоўваліся на канферэнцыі ў Ленінградзе пытанні ўдумлівага сцэнічнага ўвасаблення сучасных опер, што датычыць і нашага беларускага тэатра.

У той час, як кампазітары Масквы, Ленінграда і рада братніх саюзных рэспублік, ідучы насустрач 50-годдзю Вялікага Кастрычніка, пішуць або ўжо напісалі новыя оперы на сучасную тэму і некаторыя з іх ужо рыхтуюцца да пастаноўкі, беларускія аўтары праяўляюць пэўную інертнасць. Добра, вядома, што наш оперны тэатр узяўся да юбілею Савецкай улады нанава ажыццявіць пастаноўку «Дзяўчыны з Палесся» Я. Цікоцкага (у новай рэдакцыі). Але з новых беларускіх оперных твораў, апрача оперы Ю. Семянякі «Калі ападае лісце» (лібрэта А. Бачылы), у партфелі тэатра пакуль нічога няма.

Аб недахопах практычнага ўвасаблення савецкай оперы на сцэнах нашых тэатраў, у тым ліку, і беларускага, аб выхаванні маладых оперных кадраў гаварыла Л. Александроўская.

На творчым сходзе выступілі кампазітары Я. Цікоцкі, Г. Вагнер, дырыжор опернага тэатра І. Абраміс, саліст оперы А. Генералаў, артыстка хору З. Сакоўцава, паэт А. Бачыла, намеснік міністра культуры БССР Ю. Міхневіч. Аднак трэба сказаць, што вялікай прынцыповай гаворкі аб надзённых праблемах развіцця сучаснага опернага жанру, аб стане беларускага оперна-балетнага мастацтва на гэтым сходзе не адбылося, бі і ўдзельнічала ў ім вельмі мала творчых работнікаў, асабліва з Тэатра оперы і балета.



Мінскай гарадской нотна-музычнай бібліятэкай карыстаюцца навучэнцы і студэнты музычных школ, вучылішчаў, кансерваторыі, кіраўнікі самадзейных музычных калектываў. На гэтым здымку вы бачыце кіраўніка тэатра маладзёжнай эстрады Мінскага камбіната Уладзіміра Бучаля, які падбірае музычныя творы для новай праграмы.

Фота УЛ. КРУКА.

Аляксей КУЛАКОЎСКІ

ТАШКЕНЦКІЯ СУСТРЭЧЫ

У складзе беларускай пісьменніцкай дэлегацыі на Дэкадзе ва Узбекістане знаходзіцца і Аляксей Кулакоўскі. У братняй рэспубліцы яму давялося пабываць і раней, у студзені, калі ён быў госцем узбекскіх літаратараў. У выніку нарадзіліся яго ныя «Ташкенцкія сустрэчы».

1. БУТОНЧЫКІ НА ЛАЦКАНАХ

Шчырая гасціннасць узбекаў, мабыць, вядома ўсяму свету. І я адчуў яе на сабе. З таго часу, як прыляцеў у Ташкент, ніводнай хвіліны не быў адзінокі. Узбекскія пісьменнікі вельмі дружна і актыўна памагалі мне ва ўсіх справах, дзеля якіх я прыехаў як прадстаўнік з Беларусі. Калі трэба было, то не лічыліся з часам, адкладвалі нават сваю творчую работу.

Помню такі дзень, калі цэлая група ўзбекскіх пісьменнікаў, кіраўнікоў саюза, з самага ранку і да позняга вечара была са мною. Гэта Аскад Мухтар — першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Узбекістана, Рахмат Файзі і Аляксандр Удалоў — намеснікі старшыні, Шаміль Алядзінаў — адказны сакратар, Хакім Назір — старшыня секцыі прозы, Мумтаз Мухамедаў — вядомы празаік і дырэктар Літфонду, Вахаб Рузіматаў — намеснік рэдактара ўзбекскага літаратурнага часопіса і яшчэ некалькі чалавек, супрацоўнікаў апарату.

А потым адзін даўні ташкенцец, беларускі пісьменнік Сцяпан Іванавіч Ліхадзіеўскі, падараваў мне тры каліўцы бавоўны з распушчанымі, спелымі бутончыкамі. Яны вельмі былі падобныя на белыя ружы. Гэты букецік я доўга насіў у руках, мне здавалася, што ён нават пахне ружамі. Ішоў я па вуліцы са сваімі чароўнымі бутончыкамі і раптам заўважыў, што да лацкана аднаго сустрэчнага быў прышпілены амаль такі ж самы бутончык — нагрудны значок. Потым сустрэўся і яшчэ адзін такі чалавек, і яшчэ. Спытаў я, што гэта за адзнака, і аказалася, што ў Ташкенце праходзіць Усесаюзная нарада перадавых баваўнаводаў.

Хто з нас не чуў, не чытаў пра гэтых цудоўных, праслаўленых людзей? Мне вельмі хацелася пайсці на гэтую нараду. Але ў тыя дні ў мяне было так многа неадкладных спраў, што выбраць час для наведвання нарады ніяк не ўдавалася. Я шчыра шкадаваў, што так выходзіла, пакуль не трапіўся выпадак хоць часткова задаволіць сваё жаданне.

У канцы аднаго даволі напружанага дня мяне запрасіў да сябе ў госці Каміль Яшэн, вядомы драматург, старшыня Саюза пісьменнікаў Узбекістана. Зайшоўшы ў пакой, я адразу заўважыў, што ў некаторых гасцей знаёмыя бутончыкі на лацканах. Каміль Нугманавіч пазнаёміў мяне з Гафурам Гулямам, з дырэктарам Ташкенцкага опернага тэатра, потым пачціва і з гонарам адрэкамендаваў мне знатных баваўнаводаў. Гэта былі: старшыня аднаго з самых перадавых калгасаў Кіргізіі, Герой Сацыялістычнай Працы, дэпутат Вярхоўнага Савета рэспублікі Худанкул Абдураімаў і знатны механізатар рэспублікі Зульфія.

За сталом, устаўленым вазамі з рознай садавінай, неўзабаве размясцілася група гэтых цікавых і каларытных людзей. Гафур Гулям, папіваючы зялёны чай, так шчодра і дасціпна сыпаў анекдотамі і рознымі прыгодніцкімі гісторыямі, што ўся ўвага і мая і астатніх гасцей скіроўвалася на яго. Пасля кожнага такога выступлення за сталом узнімаўся вясёлы смех. Смяяліся мае суседзі, смяяўся і я, хоць толькі па жэстах і асобных словах крышку здагадваўся, пра што ішла гаворка.

Калі смех сціхаў, Гафур паўтараў сказанае раней на рускай мове, і тады ўжо больш за ўсіх смяяўся і захапляўся я. Гэта сапраўды было смешна. І не толькі смешна, а ўсё, што ні падаваў тут таленавіты пісьменнік, уражвала сваёй свежасцю, своеасаблівым каларытам і майстэрствам. Памяць у Гафура Гуляма і эрудыцыя надзвычайныя: да кожнага слова, да кожнага выпадку ён можа ўспомніць што-небудзь з гісторыі, з сусветнай класікі, з біяграфій выдатных людзей і свайго ўласнага жыцця. Заўважыўшы маё захапленне гэтай яго рэдкай здольнасцю, Гафур неяк асабліва цёпла ўсміхнуўся і сказаў, што аднойчы яму давялося быць у падарожжы васемнаццаць сутак і ўвесь гэты час ён расказваў анекдоты ды розныя забаўныя гісторыі. І ні разу не паўтарыўся.

Усе за сталом слухалі больш за ўсё Гафура, а ў прамежках да майго вуха па-сяброўску схіляўся Худанкул (мы сядзелі з ім побач) і шаптаў:

— Я ў гэтым годзе даў дзяржаве столькі бавоўны, што калі б прывезці яе ў Ташкент, то можна было б выслаць усе вуліцы, як снегам. Праўда, у нас мала бывае снегу, бавоўны больш.

Мой сусед быў мне на душы Падабаліся мне і яго шэпт на вуха, і яго добрая сяброўская ўсмешка, і мужчынская маладжавасць ды малайцаватасць. Адчуўшы, што гэты чалавек ахвотна адкажа на кожнае маё запытанне, я пацікавіўся, з якога ён года.

— А колькі дасцё? — задаволена, нібы нават чакаў гэтага запытання, звярнуўся Худанкул да мяне.

— Гадоў сорак пяць, — упэўнена вызначыў я.

Худанкул засмяяўся, глянуў на Зульфію, якая сядзела насупраць, і зноў нахіліўся да майго вуха:

— Роўна пяцьдзесят дзевяць.

Мне хацелася гучна выказаць здзіўленне, але Худанкул паціснуў мой локаць і прыклаў пальцы да вуснаў. Вочы яго весела смяяліся. Я зразумеў, што яму не надта хацелася, каб пра яго ўзрост ведалі жанчыны.

Потым на нейкі час нашы сяброўскія перашэпты спыніліся, бо Худанкул узяўся за работу — пачаў рэзаць на дробныя кавалкі мяса, якое падалі на стол. Падала Зульфія. Яна ўвесь час дапамагала гаспадыні і дзеля гэтага вельмі часта ўставала з-за стала. За што яна тут ні бралася, усё выходзіла ў яе неяк асабліва спрытна, акуратна і хораша. І я думаў аб тым, як гэтая, зусім яшчэ маладая жанчына, дасягнула такіх выдатных поспехаў на вытворчасці, як авалодала складанымі механізмамі на апрацоўцы і ўборцы бавоўны, як яна сама водзіць і кіруе ўборачным агрэгатам.

І вось калі Зульфія паставіла на стол мяса, то Худанкул узяўся яго рэзаць. У яго рукі, вядома ж, не жаночыя. Але тоўстыя, здавалася, не надта зграбныя пальцы хадзілі ўвішна, востры нож толькі паблісквай у іх.

Неўзабаве мяне паклікалі да тэлефона, а калі я вярнуўся, то майго суседа за сталом ужо не было. Не адразу можна было заўважыць, дзе ён, — добра што Худанкул абазваўся, як толькі я зайшоў у пакой для гасцей. Аказваецца, ён ужо сядзеў у кутку пакоя проста на падлозе, трымаў між кален вялізную, як начоўкі, дыню і рэзаў яе на кавалкі — сакавітыя, духмяныя.

На грудзях у яго вісела Залатая Зорка Героя Сацыялістычнай Працы, а побач з ёю паблісквай значок удзельніка Усесаюзнай нарады—бутончык бавоўны.

Слова бярэ чытач

ЖЫЦЦЁ—ПОДЗВІГ

На белым фоне вокладкі гэтай кнігі — турэмны засценак. Рука вязня працягвае з-за крат аркуш паперы, спісаны дробнымі літарамі: ліст на волю, ліст да тых, хто застаўся па-за кратамі і працягвае барацьбу. Колькі такіх пісьмаў не дайшло да нас, колькі іх загінула! Але — не ўсе. Не загінулі пісьмы, не загінулі таварышы мужных барацьбітоў за свабоду і шчасце чалавецтва. Героі і іх подзвігі не паміраюць, яны і сёння з намі, у шэрагах барацьбітоў. Кніжка, пра якую хочацца сказаць некалькі слоў, пацвярджае гэта.

Называецца кніжка «Вера і яе таварышы». Расказвае яна аб слаўнай дачцы беларускага народа, Героі Савецкага Саюза Веры Захараўне Харужай. Напісала кнігу польская пісьменніца Ганна Мушынская-Гофман, пераклала яе на беларускую мову Ядзвіга Бяганская.

Кніга складаецца з некалькіх апавяданняў аб жыцці і змаганні слаўнай падпольшчыцы і яе таварышаў. Уласна, не аб усім жыцці. Аповесць Г. Мушынскай-Гофман асвятляе толькі невялікі перыяд жыцця Веры Харужай — яе падпольную дзейнасць у 1925—28 гадах «на крэсах усходніх», яе работу ў Камуністычным Саюзе Моладзі Заходняй Беларусі.

Мы ведаем шмат аб гераізме, мужнасці Веры Харужай, аб яе вялікай любві да Радзімы і адданасці справе партыі. Не так даўно на экранах краіны з поспехам ішоў фільм «Пісьмы да жывых», прысвечаны гераіні беларускага народа. Тым не менш кніга Г. Мушынскай-Гофман дадала нам шмат новых штрыхоў да партрэта мужнай рэвалюцыянеркі і патрыёткі.

Нельга без хвалявання чытаць сцэну суда над Верай Харужай. Пракурор польскага санацыйнага суда пытае:

— Абвінавачваемая прызнае сябе віноўнай?

— Не, — адказвае Вера Харужая.

— Але ж ты з'яўляешся членам Камуністычнай партыі.

— Так... Я ганаруся тым, што з'яўляюся членам Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі... Вы абвінавачваеце Камуністычную партыю Заходняй Беларусі ў тым, што яна заклікала народ да ўзброенага паўстання. Але кожны павінен ведаць, што рэвалюцыя з'яўляецца вынікам развіцця класавай барацьбы, і няма такой партыі, якая б магла штучна выклікаць рэвалюцыю... З'яўляючыся членам Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, я добра разумею свой рэвалюцыйны абавязак... І застануся вернай гэтаму абавязку і тады, калі выйду з астрога...

Значнае месца адводзіць аўтар таварышам Веры Захараўны Харужай — беларускім і польскім — па сумеснай падпольнай рабоце. У заключным раздзеле кніжкі расказваецца пра апошнія гады жыцця Веры Харужай, пра яе барацьбу з гітлераўскімі захопнікамі.

Кніга «Вера і яе таварышы» выдадзена выдавецтвам «Беларусь» і адрасуецца школьнікам старэйшага ўзросту. Яна, безумоўна, знойдзе шырокага чытача і прынясе вялікую карысць у справе выхавання падрастаючага пакалення.

А. МАРЦІНОВІЧ,
студэнт БДУ імя Ул. І. Леніна.

Выйшлі з друку

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»

Іван Шамякін. Збор твораў у пяці тамах. Том 5. 1966 г. Тыраж 7 600 экз., стар. 500. Цана 1 руб. 06 кап.

Іван Мележ. Подых навальніцы. Раман. З палескай хронікі. Мастак Н. Паплаўская. 1966 г. Тыраж 17 500 экз., стар. 568. Цана 1 руб. 16 кап.

Рыгор Няхай. Сарочы лес. Аповесць. Мастак П. Калінін. 1966 г. Тыраж 12 тыс. экз., стар. 192. Цана 34 кап.

Ленін заўсёды з намі. Зборнік твораў беларускіх пісьменнікаў, прысвечаных Уладзіміру Ільічу Леніну. Склаў Ул. Шыцік. Мастак С. Кавалёў. 1965 г. Тыраж 5 500 экз., стар. 124. Цана 34 кап.

Рэпертуар скрыпача. Для музычных школ. Склаў П. Валадарскі. Мастак В. Жыжэнка. 1966 г. Тыраж 800 экз., стар. 32. Цана 66 кап.

Напярэдадні пятага пісьменніцкага

Матэрыялы друкуюцца ў парадку абмеркавання

ПРАБЛЕМЫ І КЛОПАТ ПАЭЗІІ

Алег ЛОЙКА

Сем год мінула ад папярэдняга, IV з'езда пісьменнікаў Савецкай Беларусі. Час не малы. Нават гавораць, што за сем гадоў паспявае змяніцца характар чалавека. Мне ж хочацца сёння паглядзець, што ж змянілася за гэты час у нашай паэзіі.

Наша паэзія, як і раней, абапіралася і абапіраецца на прынцып партыйнасці, яна служыць вялікім пераўтваральным ідэям камунізма, імкнецца апаэтызаваць наш час і сучасніка. Як і раней, яна развівалася. І развівалася ў апошнія гады так імкліва, што смела можна сказаць: за гэты час не толькі новыя тэмы і вобразы, падказаныя рухам часу, змянялі яе—адбыліся істотныя якасныя змены. Прычым яны, на маю думку, закранулі ўсе актыўныя сілы прадстаўнікоў розных пакаленняў. Што гэта так, лёгка пераканацца, параўнаўшы, напрыклад, зборнікі Петруся Броўкі «Сонечнымі днямі» (1950) і «Пахне чабор» (1959); вершы Максіма Танка і Аркадзя Куляшова пачатку 50-х гадоў з іх зборнікамі «Мой хлеб надзённы», «Глыток вады», «Новая кніга»; зборнік вершаў Петруся Макаля 1955 года «Першы след»—з яго кнігай «Круглы стол» (1964). І, якасна змяніўшыся, наша паэзія з новай, яшчэ большай сілай служыць усё той жа пачэснай справе паэтычнага асваення сучаснасці і выхавання новага чалавека.

Але ў чым заключаліся гэтыя якасныя змены, як яны адбываліся? Са шкадаваннем мусім адзначыць, што высвятляць іх цяжка найперш за ўсё таму, што іх аналізам наша крытыка займаецца вельмі мала. У рэцэнзіях, звычайна, кнігі паэзіі аўтары разглядаюць у адрыве ад агульных заканамернасцей развіцця нашай паэзіі, не вызначаючы ў ёй асноўных працэсаў і не звязваючы з імі сутнасці і значэння той ці іншай кнігі. Рэцэнзенты як бы працуюць на малой плошчы аднаго са зборнікаў, забываючыся, што кожная кніжка існуе не ізалявана, а ў агульным патоку літаратуры, і што яны (рэцэнзенты) абавязаны не толькі раскрыць ідэйны змест, ацаніць майстэрства і вызначыць асаблівасці той ці іншай кнігі, таго ці іншага аўтара, але і паказаць месца кнігі і ўсёй творчасці аўтара ў сучаснай паэзіі, што істотна дапамагала б высвятляць агульную карціну заканамернасцей, тэндэнцый і плыней у нашай паэзіі ўвогуле.

Паміж іншым, добра было б, калі б нашы рэцэнзіі вырысоўвалі перад чытачом не толькі саму змястоўнасць той ці іншай кнігі, але нейкім чынам і самую асабістасць паэта—чалавека, які стаіць за кнігай. Увага да паэзіі была заўсёды і ўвагай да тых, хто яе стварае. У нас у свой час, яшчэ ў дваццатыя гады, была складвалася добрая традыцыя літаратурных партрэтаў. Аднойчы прачытаўшы такія матэрыялы пра Васіля Каваля, Валерыя Маракова, я іх добра запомніў на ўсё жыццё. Цяпер чамусьці гэтую традыцыю ўспамінаюць даволі рэдка.

Але вернемся да гаворкі аб асноўных тэндэнцыях і заканамернасцях развіцця нашай паэзіі ў апошнія гады. Яна ў гэты час арыентавалася на паэзію высокіх дум і пачуццяў, на найвышэйшыя крытэрыі. Яна, за вельмі рэдкімі выключэннямі, не збівалася на эстраднасць, на пошукі лёгкай, сенсацыйнай славы. Былі ў яе свае поспехі, былі і недахопы, але не ад заігрывання з неперабарлівым чытачом. Яна і без гэтага расшырыла свае сувязі з чытачамі, расшырыла, дзякуючы перш за ўсё свайму зноў жа якаснаму росту, дзякуючы няспынным пошукам як старэйшых, так і маладых паэтаў.

Поспехі нашай паэзіі за час паміж пісьменніцкімі з'ездамі былі абумоўлены яе непасрэднымі сувязямі з жыццём. Перш за ўсё гэтым крытэрыем вымяраліся кнігі, адзначаныя рэспубліканскімі прэміямі імя Янкі Купалы,—зборнікі Уладзіміра Дубоўкі «Палеская рапсодыя», Міколы Аўрамчыка «Сустрэча былых канагонаў», Сяргея Дзяргая «Чатыры стыхіі», Кастуся Кірэенкі «Смага», паэма Анатоля Вялюгіна «Вецер з Волгі».

Пры гэтым і само жыццё раскрывалася ў нашай паэзіі шмат у чым непадобна да таго, як было гэта ў 50-я гады, ці, дакладней кажучы, да гістарычнага XX з'езда партыі. У атмасферы далейшага развіцця сацыялістычнай дэмакратыі, аднаўлення і далейшага ўсталявання ленінскіх норм у жыцці савецкага грамадства паэзія яшчэ больш наблізілася да чалавека, нашага сучасніка. Яна яшчэ больш наблізілася да сацыяльнага аналізу сучаснасці і глыбокага раскрыцця лёсу асобы ў нашым грамадстве. Зрухі ў нашай паэзіі ў гэтым сэнсе былі сапраўды наватарскія і сталі такой яе важнай заканамернасцю, плён якой мы яшчэ далёка не ўвесь сабралі.

Людзям хочацца шчырай лірыкі!
Не пра вінцікі, пра сябе, —

пісаў у адным з вершаў Генадзь Бураўкін, слушна вызначаючы новыя запатрабаванні чытача. Такой шчырай лірыкай сталі апошнія зборнікі многіх паэтаў усіх пакаленняў. Лірызацыя зместу, актыўнае аўтарскае выяўленне душэўнай сардэчнасці і цеплыні, павышанай увагі да чалавека, да яго любві і нянавісці—вось што як бы пераўтварала нашу паэзію і вызначала адну з яе сённяшніх заканамернасцей. Гэта засведчылі нават назвы зборнікаў — «Пахне чабор», «Мой хлеб надзённы», «Адрас любві», «З любоўю і нянавісцю зямною»...

Праўду жыцця нашага народа, паказваючы Беларусь XX стагоддзя ў яе гістарычнай хадзе ад дарэвалюцыйнай мінуўшчыны да сонечнай явы сённяшняга дня, на свой лад, ідучы ад уласнага лёсу, ад лёсу народа, паэтызуе Пятрусь Броўка. Тое ж, толькі па-свойму, робіць і Максім Танк, раскрываючы багацце сваіх дум і пачуццяў, абымаючы імі свет і людзей, на мой погляд, найбольш маштабна сярод усіх нашых паэтаў. Хоць, мабыць, ёсць у яго і непераможаны «супернік» — Аркадзь Куляшоў. Яго «Новая кніга» і цудоўны, на самых высокіх нотах лірызму і драматызму напісаны «Маналог» («Маладосць» № 2 за гэты год) — гэта сапраўды споведзь-роздум чалавека, які прайшоў праз гераічныя і нялёгкія 20-я і 30-я гады і з вышыні сённяшняга дня памяццю сэрца, што зазнала радасць парывання і горыч страт, уваскрашае недалёкае мінулае, асэнсоўвае здабыткі, падводзіць вынікі і зноў рвецца наперад, поўны веры і ўпэўненасці.

Але ўсё ж Танк, уступаючы Куляшову ў паасобных вершах сілай перажывання, застаўся, на мой погляд, шырэйшым у сваім пранікненні ў жыццё. Куляшоў—як бы паэт толькі аднаго пакалення, Танк—як бы паўпрэд усіх пакаленняў нашых сучаснікаў. Прычым не трэба забываць, што Танк і на працягу апошніх сямі гадоў быў, відаць, самы актыўны паэт.

З чалавекам цяжкога лёсу, а праз яго—з драматычнымі шляхамі народнага жыцця на перавалах Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага часу сустрэліся мы ў сціплай, але мужнай і сапраўды паэтычнай кнізе Міколы Аўрамчыка «Сустрэча былых канагонаў». Толькі ў атмасферы поўнага даверу да праўды жыцця, да лёсу рэальнага чалавека змагла з'явіцца гэта кніга.

І яшчэ ў апошнія сем год адбывалася ў нас у паэзіі напружанае паглыбленне роздуму, ацэнкі і пераацэнкі многіх з'яў і фактаў жыцця — не рэвізіяністцкай якой-небудзь пераацэнкі, а той, што абумоўлівалася нашым імкненнем глыбей разабрацца з вышыні сучасных уяўленняў у дні ўчарашнім і сённяшнім. «Новая кніга» А. Куляшова, паэма А. Русецкага «Яго вялікасць», «Чатыры стыхіі» С. Дзяргая—красамоўныя сведкі паглыблення інтэлектуальнасці ў нашай паэзіі.

Апошнія сем гадоў былі гадамі сур'ёзнага пасталення новага пакалення паэтаў, якім сёння па трыццаць ці крыху больш трыццаці гадоў. У канцы 50-х гадоў, калі яны даволі дружна выступілі ў друку, нельга было сказаць, што яны прынеслі сапраўды ўжо нешта новае, сваё ў шматгалосы хор нашай паэзіі. Большасць з іх тады мела па аднаму—два зборнікі. Цяпер у большасці з іх па тры-чатыры паэтычныя кнігі. Я, вядома, не перабольшваю значэння колькасці кніг у сэнсе ўкладу ў літаратуру, але колькасць—таксама паказчык, ва ўсякім разе—паказчык творчай актыўнасці маладых. І гэта таксама адна з адзнак поспехаў нашай паэзіі апошніх сямі год.

Кнігі маладых аўтараў, пачынаючы з канца 50-х гадоў, ішлі проста лавінаю. У 1955 годзе мы мелі дзве першыя кнігі маладых—«Першы след» П. Макаля і «Паходныя кастры» С. Гаўрусёва. У 1957 годзе выйшла першая кніга Н. Гілевіча — «Песня ў дарогу». 1958 год даў ужо чатыры дэбюты — «Матчыну душу» Ул. Караткевіча, «Вясновыя барозны» Уладзіслава Нядзведскага, «Сакавік» Еўдакіі Лось, «Не ўсе лугі пакошаны» Міколы Арочкі. І аж восем зборнікаў маладых мы мелі ў 1959 годзе, калі з першымі кнігамі выступілі Рыгор Барадулін, Кастусь Цвірка, Юрась Свірка і інш. У наступных гадах дэбютавалі і сёння маюць па дзве-тры кнігі Генадзь Бураўкін, Данута Бічэль-Загнетава, Раман Тармола, Генадзь Кляўко, Іван Сіпакоў, Анатоль Вярцінскі і інш. Аўтарамі пакуль што адзінкавых, але цікавых кніг з'яўляюцца сёння ў кагорце маладых Алесь Наўроцкі, Анатоль Грачанікаў, Васіль Макарэвіч, Вера Вярба, Міхась Рудкоўскі. Свае першыя кнігі восьвось будуць трымаць у руках Мікола Маляўка, Анатоль Сербантовіч, Мікола Кусянкоў, Мікола Купрэеў, Рыгор Семашкевіч, Хведар Чэрня, якія заявілі аб сабе ў друку ў апошнія гады. Пералік гэты не можа не настройваць на аптымістычны лад. А сёння ж ідзе ў літаратуру яшчэ больш маладое і, на радасць, не менш шматлікае пакаленне, якое нарадзілася пасля вайны і не помніць яе, якое фармавалася ды—што я гавару!—яшчэ фармуецца ў самыя апошнія гады. Новыя тэмы, новыя перажыванні, новыя адкрыцці чакаюць нас...

Усе з маладых, хто помніць вайну, шырока паказалі яе, дапоўнілі карціну, якую ўжо стварылі да іх, дапоўнілі па-свойму, як толькі яны і ніхто іншы мог зрабіць. У гэтым я бачу асноўнае са свайго, укладзенага маладымі ў паэзію. Прыкметна і другое, звязанае з іх творчасцю,—пошукі новых форм выяўлення, сродкаў, стыляў. Але гэтыя пошукі маладых ішлі поруч з пошукамі старэйшых, не былі якойсьці асобай прывілеяй, вызначальнай рысай толькі маладых. І—трэба сказаць шчыра—усё ж старэйшыя, такія, напрыклад, як Максім Танк ці Аркадзь Куляшоў, а не маладыя, неслі «галоўную службу». Сённяшнім трыццацігадовым трэба яшчэ цягнуцца за сваімі правафланговымі, бо ўжо б'е час несці галоўную службу і ім.

Нельга, вядома, сказаць, што асэнсаванне сучаснага матэрыялу ў паэзіі трыццацігадовых не несла ў сабе навізны ў параўнанні з тым, як яго асэнсоўвалі старэйшыя. Была часам і большая тэмпераментнасць, і вастрэй ставіліся асобныя пытанні. І ўсё гэта патрабуе грунтоўнага і шырокага аналізу, заслугоўвае сур'ёзнай увагі нашай крытыкі.

Пра што-што, а пра пошукі ў нас за апошнія сем год гаварылася многа. Чакалі наватараў, гаварылі пра наватараў, спрачаліся пра наватарства. Гэтая гаворка была ўжо сама па сабе сімптаматычнай: паэзія шукала новых дарог. Але ізноў жа як часта мы нібы варыліся ва ўласным саку: не толькі не імкнуліся разабрацца ў заканамернасцях развіцця паэзіі, а і не спрабавалі нават шырока супастаўляць яе з заканамернасцямі іншых суседніх і несуседніх літаратур, не намагаліся ўбачыць яе ў сувязях з працэсам усесаюзнага развіцця паэзіі, у сувязях з працэсамі развіцця сённяшняй сусветнай літаратуры ўвогуле. Нашы літаратуразнаўцы да падрабязнасці вывучылі, напрыклад, факты ўплываў, ідэйнай і вобразнай пераклічкі беларускіх паэтаў XIX—пачатку XX стагоддзяў з паэтамі рускай і польскай класікі. Ды, на жаль, яны пакуль што зусім не бяруцца за высвятленне падобных жа сувязей у сучаснай паэзіі. А такое вывучэнне, на маю думку, шмат у чым дапамагло б і вырашэнню праблемы наватарства, і высвятленню ўнутраных заканамернасцей нашай паэзіі.

Адзін з вершаў Н. Хікмета, які я некалі прачытаў у «Иностранной литературе», быў пра гераічную смерць кавалерыста. Міма яго, цераз яго праносіліся коні. Жыццё байца затухала. Конніца знікала за гарызонтам... Усё гэта паэт перадаваў нечаканым, надзвычай моцным сродкам — паўтарэннем слоў з адным коранем, якія паказвалі і затуханне жыцця і рух коннай лавіны: конніца, конн'кі, коні, конь, — так, здаецца, было ў Назыма Хікмета. Потым я ўспамінаў гэты верш, калі чытаў у Ул. Караткевіча пра лістапад:

Як песня, з галін злятае
Лісце, лісце.
Залацістае лісце,
Сто лісцяў,
Дзесяць лісцяў,
Ліст.

Верш Хікмета я ўспамінаў яшчэ і тады, калі чытаў у Наўроцкага пра восенькі вецер, які «свістаў спачатку ў дудачку, потым у дудку, а ўжо затым у дуду».

«Наватарства!»—узрадавана аб'яўлялі некаторыя з маіх таварышаў. А на самой справе?..

Вядомы даследчык літаратуры П. Н. Беркаў лічыць, праўда, такое перанясенне прыёмаў паэтыкі на нацыянальную глебу наватарствам, але адносным, лічачы, што «акт літаратурнай творчасці ёсць (ці, у ідэале, павінен складацца) са спалучэння элементаў традыцыяналізму і элементаў наватарства».

Элементаў наватарства, трэба сказаць, за апошні час наша паэзія займела многа. І гэта добра. Наша маладая лірыка лепшымі вершамі Барадуліна, Караткевіча, Наўроцкага, Сіпакова і іншых паказала свежыя ўзоры спалучэння вобразаў і рытмаў роднага фальклору з тымі павевамі ў сусветнай паэзіі, якія ідуць, напрыклад, ад П. Неруды, Н. Хікмета, Г. Містраль. Але, мне здаецца, варта напомніць пра адну перасцярогу: мы павінны заўсёды быць супраць некрытычнага стаўлення да таго, што да нас ідзе як элементы наватарства. І—галоўнае—не думаць, што яны—галоўная прыкмета наватарства. Трэба творча асвойваць гэтыя элементы, арганічна яднаць іх з народнай асновай нашай паэзіі. Вопыт як нашай, так і кожнай іншай паэзіі паказвае, што толькі арганічнае, сінтэтычнае спалучэнне нацыянальных асноў паэзіі з уплывамі на іх іншых форм пры ахопе і выяўленні пісьменнікам усяго таго, што ёсць у нетрах эпохі і народа, і нараджае паэтаў, падобных да Маякоўскага і Янкі Купалы, да Хікмета і Лоркі. Дарэчы, той жа Лорка ў сваёй сутнасці выключна нацыянальны. Ён па-сучаснаму вельмі нешматслоўна-глыбакадумны, экспрэсіўна-напружаны, асацыятыўны. І ўсё гэта ў яго—у форме народнай іспанскай песні. Яго стыль, як і стыль Хікмета, Г. Містраль, Дарыё—сінтэз народнай асновы, з якой гэтыя паэты выраслі, з творча асвоенай паэтыкай іншых паэтаў. Адсюль іх навізна і сіла ўздзеяння. У нас да такога ж узроўню падымаецца сёння, на маю думку, Максім Танк. Каб з нашых пляцовак стартавала на сусветны форум услед за Танкам і новая плеяда—вось аб чым трэба нам дбаць.

У апошнія гады празаікі нямала гаварылі аб неабходнасці найхутчэйшага пераадолення «бар'еру», які ўсё яшчэ «аддзяляе» нашу прозу ад тэм і праблем жыцця горада. Гаварылася—і зусім слушна—аб неабходнасці пошукаў у гэтай сувязі і ў галіне стыляў і паэтыкі. Паэтам, мне здаецца, таксама даўно пара пачаць адпаведную размову. Жыццё горада, духоўны свет гараджаніна, яго штодзённыя клопаты і пошукі яшчэ, на жаль, не занялі адпаведнага месца ў нашай паэзіі. І што з'яўляецца можа найбольш складаным—гэта тое, што ў нас амаль няма нацыянальных традыцый, звязаных з урбаністычнай тэмай. Наш фальклор — ад сялянскага жыцця. Наша лірыка дасюль абапіраецца на яго, а тут трэба знайсці такое, што было б і ў рэчышчы нацыянальных традыцый і ўсімі сваімі фарбамі імпанавала гараджаніну. Так, трэба знайсці і трэба шукаць, калі мы хочам, каб нашай паэзіяй па-сапраўднаму зацікавіўся шматмільённы жыхар нашых гарадоў.

Наша паэзія, як мы ўжо сказалі, не збівалася на эстраднасць, на танную сенсацыйнасць. Гэта добра, але не зусім добра тое, што ў яе малаватая цяга да публічнасці, да масавага слухача. І крыўдна, што, напрыклад, сапраўды трыбунныя, высокаграмадзянскія, непаўторныя па сваёй мастацкай арыгінальнасці вершы Пімена Панчанкі так і не гучаць у нас з эстрады, не збіраюць шматтысячных аўдыторый на вечарах паэзіі. Думаецца, мы мала шукаем сродкаў прывучыць нашага шматмільённага чытача да актыўнага, сапраўды масавага ўспрымання нашых здабыткаў. Што грахі таіць, не часта мы збіраем сваімі выступленнямі сапраўды ма-

[Заканчэнне на 4-й стар.].

Сурэн Аганесавіч Мірзаян—ветэран Барысаўскага народнага тэатра. Ён тут і акцёр і мастак. Ім сыграна некалькі цікавых роляў, яму ж належыць афармленне амаль усіх спектакляў.
Фота В. МАНЬКО і Э. ТРАГУБОВІЧА.

Паэтычная паверка

Нічыпар ЧАРНУШЭВІЧ

ЗМЕНЛІВЫ ЧАС...

Зменлівы век,
Зменлівы час,
Не пакідай ты нязменнымі нас,
Нязменнымі нас.

Боязна быць,
Нібы цень на сцяне.
Думкам маім я не дам касцянець,
Не дам касцянець.

Зменлівы час,
Нас не раз падгані —
Не засядзецца б ва ўчорашнім дні,
Ва ўчорашнім дні.

Добра,
Як людзям блішчыш маяком,
Лепш —
На іх шчасці не віснеш замком,
Не віснеш замком.

Добра —
Хвалу гучным датам аддаць,
Лепш —
Пазыўнымі ў дзень заўтрашні стаць,
Ў дзень заўтрашні стаць.

Зменлівы век,
Зменлівы час,
Не пакідай ты нязменнымі нас,
Зменлівы час.

ШЧАСЦЕ

Мо песня ў табе ад тугі анямела,
Бо радасці ў сэрцы ні звання.
Ды ўслухайся: ў ім ажывае нясмела
Аб шчасці тваім прадчуванне.

А што яно, шчасце? Мо стаць лепш відушчым,
Душой, для жывых не скупою?
Адчуць сябе раптам і большым, і дужшым,
Ўзляцець над самім жа сабою?

Ці ў чорны свой час нечакана уведаць,
Што ты не атопак, не зрэб'е,
Што людзі ў цябе так, як некалі, вераць,
Што ў нашым жыцці ты патрэбен?

А можа ў каханні шчаслівы твой час?..
Па-рознаму шчасце наведвае нас.

ЗНІЧКА

Быццам баіцца спазніцца,
Быццам на небе ёй золка,—
Гляньце, па вогненнай ніці
Коціцца, падае зорка.

Падаць з вышынь, мабыць, лёгка,
Мо не паспееш і вухнуць,
Вось і зямля недалёка,—
Зорка там мусіць патухнуць.

Любая, стой, супыніся,
Лепш над зямлёю застанься,—
Трошкі святлей стане ўнізе,
Бачыць далей стануць там ўсе.

Кажуць, што зор незлічона?
Не, іх зусім яшчэ мала:
Ноччу было б не так чорна,
Калі б святла іх хапала.

ДОБРАЙ РАНІЦЫ, НАШАЯ РАДАСЦЬ!

Паглядзі, як вясна ходзіць скора!
Зноў трапечуцца ў шчасці асіны—
Дзе лісцё, дзе галлё—не пазнаць.
Гаспадарыць зычлівая вясна!
Дык пазычым і мы ў яе сілы.
Бо пара
Песняй клічнай, размашыстай, спорнай
Збур'янелыя сэрцы ўзараць.

А наўкола нідзе ўжо не гола,
Бо працуе без продыху сонца.
Яго сэрца сагрэла зямлі нашай сокі
І шаўковую шчэць збажыны.
А вясна з жаўрукамі ўзлятае высока,
І чуцён яе покліч наўкола:
«У жаданыя дні накіруйце чаўны,
Бо пара
Расхляпесціць жыццю ўсе аконцы —
Каб жывое жыло,
Спарахнелыя сэрцы ўзараць».
— Добрай раніцы, нашая радасць!

ПОШЧАК

Размлелую зямлю
Навальніца хвошча —
Буду слухаць, буду слухаць
Іх дыхання пошчак.

Дружыць з рэчкаю лазняк,
Лісце ў ёй палошча...
Уваходзь жа ў мае грудзі,
Кожнай дружбы пошчак.

Задуменна хлапчукі
Штось майструюць з дошчак.
Хай жа стане маім скарбам
Дум і мар іх пошчак.

Ён—яна знайшлі сваю
Радасць у любошчах...
Узбагаць і мне ты радасць,
Іх кахання пошчак.

Запаўняй, жыццё, валтузь
Да кутоў, да зморшчак
Душы, прагныя пачуць твой
Шматгалосы пошчак.

II. ЖАНЧЫНА У ПАРАНДЖЫ

У выхадны дзень Сцяпан Іванавіч Ліхадзіеўскі, як ташкенцкі старажыл, узяўся паказаць мне ўвесь горад. Хто быў у Ташкенце, той ведае, што гэты горад вельмі своеасаблівы. Ён падзяляецца на два гарады: стары і новы.

Мы паехалі ў стары, бо з новым я ўжо быў трохі знаёмы.

— Што выберам для большага каларыту? — спытаў у мяне Сцяпан Іванавіч.

— Вядома, рынак, — адказаў я.

— О, тут ёсць чаго паглядзець, на дзень хопіць, калі добра зацікавіцца.

Але цікаўнасць мая крыху зніжалася тым, што было гразкавата. З самага ранку ў горадзе імжэў нібы асенні, нібы вясенні дождж. Сцяпан Іванавіч не зважаў на гэта і цягнуў мяне ад латка да латка, ад прылаўка да прылаўка, з аднаго рада ў другі.

— Ці такая гразь тут некалі была? — суцяшаў ён мяне. — Галошы падвязвалі. А цяпер жа асфальт... Любата!

Ад гэтай любаты мае чаравікі ўсё больш і больш рабіліся падобнымі на лапці. Паглядваючы на іх, я пачынаў ужо часамі адставаць ад свайго нястомнага спадарожніка і гіда, а то і бурчэць на яго.

Каб хоць крыху зацікавіць мяне і затрымаць на тым рынку, які, пэўна ж, вельмі падабаўся яму самому, Сцяпан Іванавіч стаў усюды прапаноўваць мне чаго-небудзь пакаштаваць: то лустачку сушанай дыні, якую там сякуць проста сякерай, то якой-небудзь садавіны, то адмысловага перніка.

Праз некаторы час мая «авоська», якую я прадбачліва ўзяў з сабою, была поўная ўсялякага ўзбекскага «каларыту», і я зноў пачаў церабіць Сцяпана Іванавіча, каб ён хутчэй выводзіў мяне адтуль. Абяцаў яму, што ахвотна пайду куды толькі ён скажа: хоць у мячэць, хоць на Пахтахор, абы толькі не таўчыся больш тут, у гэтакім натоўпе ды яшчэ па гразі.

Магчыма, што я многа трачу ад гэтага, але чамусьці мяне ніколі не вабілі шумныя рынкі і «гумы». Калі часам даводзіцца трапляць туды, скажам, у Мінску ці ў іншых гарадах, то стараюся хутчэй купіць, што меў на ўвазе, і — айда адтуль. Хіба ўжо што вельмі адметнае ды своеасаблівае спыніць увагу. Помню, на Нясвіжскім рынку я напаткаў дзядзьку, які прадаваў хораша вытачаныя верацёны, вельмі падобныя на тыя, што выточваў некалі мой бацька. Купіў напамяць адно верацяно і адразу пайшоў.

Мабыць, зусім іншых поглядаў трымаўся тут Сцяпан Іванавіч, і мне грэх было ўвесь час дакараць яго за гэта. Каб да рэшты рассеяць маю інертнасць, ён завёў мяне ў больш-менш ціхі куток і, добразычліва пасмейваючыся, сказаў:

— Вы яшчэ не ведаеце, што я вам тут пакажу... І не здагадваецеся...

— А што? — зацікавіўся я.

— Жанчыну!.. Цікавую жанчыну! Вось пачакайце! Між іншым, я ўвесь час і шукаю яе тут.

— Якую ж гэта?

— Жанчыну ў паранджы.

— Ну, такой мы не знойдзем.

— Знойдзем! — запэўніў Сцяпан Іванавіч. — Абавязкова знойдзем! Я тут бачыў такую.

Дзеля гэтага я згадзіўся зноў сноўдацца сярод людзей, зноў мясіць хоць і не глыбокую, але да прыкрасці ліпкую гразь.

Хадзілі мы яшчэ гадзіны дзве, перабралі, пераглядзелі ўсе рыначныя закуткі, але жанчыны ў паранджы так і не знайшлі.

III. ПЕСНІ ВЯСНЫ

У клубе пісьменнікаў быў літаратурны вечар, прысвечаны юбілею газеты «Узбекістон Маданіяці», сабрата нашай «Літаратуры і мастацтва». Мяне запрасілі прыняць удзел у гэтым вечары і выступіць са словам прывітання.

Усякая работа, усякія нагрузкі мне не страшныя, абы толькі не выступаць з прамовай. Але ў Ташкенце, сярод шчырых сяброў, я не адчуваў асаблівай скаванасці, калі даводзілася гаварыць тосты або расказваць аб справах беларускіх пісьменнікаў.

Таму я прыняў запрашэнне, і потым быў вельмі задаволены і ўдзячны маім сябрам за тое, што яны мяне сюды запрасілі. На вечар прыйшлі амаль усе найбольш выдатныя пісьменнікі Узбекістана: Айбек, Кахар, Гафур Гулям, Зульфія. Мне вельмі прыемна было з імі пазнаёміцца.

Прыйшлі сюды і многія дзеячы мастацтва, прадстаўнікі ЦК Кампартыі Узбекістана, Міністэрства культуры. Сярод іх я заўважыў нямала вельмі цікавых людзей, з вялікай эрудыцыяй, і ў той жа час вельмі сціплых, таварыскіх.

Рэдактара газеты «Узбекістон Маданіяці» Лазіза Пулатавіча Каюмава ўсе тут называюць самым маладым доктарам навук. Сапраўды, яму яшчэ толькі крыху больш за трыццаць, а ён ужо шырока вядомы філолаг, прафесар. Пазней я сустракаўся з ім яшчэ некалькі разоў, і ў мяне засталося вельмі прыемнае і светлае ўражанне ад гэтых сустрэч і гутарак.

Загадчык аддзела культуры ЦК Кампартыі Узбекістана Шэрмухамедаў — кандыдат навук, а яго намеснік — літаратар, здольны перакладчык з рускай мовы на ўзбекскую. Пазней я быў на прыёме ў гэтым аддзеле і адчуў вялікую прыемнасць ад таго, што размова аб літаратуры ішла там не наогул, а менавіта пра спецыфіку літаратурнага працэсу, пра найбольш глыбокія і надзённыя творчыя пытанні.

Хацелася б адзначыць, што Узбекістан часам хочацца назваць, ну проста-такі, краінай літаратараў. Першы сакратар ЦК Кампартыі рэспублікі — пісьменнік, намеснік старшыні Савета Міністраў — пісьменнік, старшыня Камітэта па радыёвяшчанню і тэлебачанню—пісьменнік, дырэктар кінастудыі — таксама. Мабыць, і яшчэ ёсць пісьменнікі на дзяржаўных пасадах. Калі не ў Ташкенце, то ў абласцях, бо там у кожнай вобласці ёсць аддзяленні Саюза пісьменнікаў.

З многімі літаратарамі пазнаёміўся я на юбілейным вечары, некаторыя з іх надоўга застануцца ў маёй памяці. Запомніліся мне і канцэртныя выступленні на тым юбілейным вечары.

Упершыню тут убачыў я зблізку Тамару Ханум, народную артыстку СССР. Спачатку яна выступіла з трыбуны з цікавай прамовай у сувязі з юбілеем літаратурнай газеты, а потым мы ўсе слухалі і глядзелі яе ў канцэрце: яна спявала і танцавала. Голас свежы, мілагучны, вельмі прыемнага тэмбру. І рухі ў танцы лёгкія, грацыёзныя.

Глядзеў я ў канцэрце і танцы народнай артысткі СССР Тургунбаевай. І паспрабуй тут зноў абысціся без здзіўлення і захаплення! Я ўжо да гэтага ведаў, што Тургунбаевай за пяцьдзесят, што яна ўжо не выступае з сольнымі нумарамі, што ёй хапае работы як мастацкаму кіраўніку шырока вядомага ансамбля «Бахор». І вось знайшла выдатная актрыса час, знайшла ў сабе вялікую эмацыянальную і прафесіянальную сілу і выступіла ўзапар з трыма народнымі танцамі. Ды яшчэ як выступіла! Усе былі проста зачараваны яе высокім, своеасаблівым майстэрствам.

Пасля яе выступлення на сцэну выйшаў заслужаны артыст рэспублікі Кахраман Дадаеў—малады прыгожы хлопец з трыма бубнамі. Ударыў ён адзін раз, ударыў другі... Загучэў адзін бубен, загучэў другі. А потым усе тры пайшлі гуляць у яго над галавою, і кожны ўзлятаў ледзь не пад самую столь, і кожны вяртаўся, куды яму трэба было, натыкаўся на пальцы або на далонь артыста і падаваў свой голас. І зусім не аднолькавыя былі гэтыя галасы, хоць бубны з выгляду ўяўляліся аднолькавымі. У сваім зладжаным ансамблі яны вабілі цікавай, захапляючай і вельмі рытмічнай мелодыяй. Гэта было вялікае майстэрства маладога бубніста, не цыркавое, не эксцэнтрычнае, а сапраўды музыкальнае, высокамастацкае.

Потым выступалі яшчэ майстры сольнага спявання, выканаўцы жанравых гумарыстычных і народных узбекскіх песень.

Апошнім выйшаў на сцэну зусім яшчэ юнак, сціпла і трошкі разгублена пакланіўся. У руках у яго быў узбекскі нацыянальны інструмент накшталт домры. Юнак пачаў спяваць пад уласны акампанемент старажытныя песні ўзбекскага народа. Праспяваў адну і ціха пайшоў, відаць, не прэтэндуючы на асаблівы поспех. Але ступіў некалькі крокаў, і зала дружнымі, патрабавальнымі апладысментамі вярнула яго назад. Праспяваў яшчэ адну песню, яшчэ больш пранікнёна і задушэўна. Апладысменты шуганулі бурнай хваляй і зноў яго не пусцілі са сцэны. Давялося спяваць яшчэ, і ўсё гэтак жа хораша і мілагучна, з нясслабным натхненнем.

— Вельмі здольны артыст,—выказаў я сваё захапленне Аскаду Мухтару, які сядзеў побач.— З вялікімі перспектывамі!

— А гэта не артыст, — мякка запярэчыў Аскад.—Гэта Дадахан Хасанаў, студэнт універсітэта. Ён паэт, кампазітар і журналіст. Акрамя таго, захапляецца народнымі песнямі. Займаецца на факультэце журналістыкі і найбольш увагі аддае паэзіі і газетнай справе.

Я слухаў выступленні і, здаецца, ні на адну хвіліну не прыходзіла да мяне адчуванне, што на дворы ўсё ж такі канец зімы, ідзе халодны дождж, часам уперамежку са снегам. Увесь гэты час мне ўяўлялася вясна, сонечная, зялёная, тая жаданая пара, калі прыедуць да нас на Дэкаду госці з Узбекістана і на беларускіх сцэнах прагучаць іх цудоўныя, незабыўныя песні.

ЗАКЛІКІ ЦК КПСС

ДА 1 МАЯ 1966 ГОДА

[Заканчэнне. Пачатак на 1-ай стар.]

71. Работнікі нафтавай і газавай прамысловасці! Павялічвайце здабычу нафты і газу! Хутчэй асвойвайце новыя нафтавыя і газавыя месцанараджэнні!

72. Работнікі хімічнай прамысловасці! Змагайцеся за павелічэнне выпуску і павышэнне якасці хімічных прадуктаў для вытворчасці тавараў народнага ўжытку! Больш мінеральных угнаенняў і сродкаў аховы раслін для сельскай гаспадаркі!

73. Савецкія геолагі! Хутчэй адкрывайце незлічоныя багацці нетраў нашай Радзімы!

74. Савецкія будаўнікі, работнікі прамысловасці будаўнічых матэрыялаў! Паспяхова выканаем намечаную XXIII з'ездам КПСС праграму будаўнічых работ у новай пяцігодцы!

75. Савецкія будаўнікі! Павышайце тэмпы, паляпшайце якасць і зніжайце кошт будаўніцтва! Хутчэй уводзьце ў дзеянне вытворчыя, жылыя, камунальныя і культурна-бытавыя аб'екты ў горадзе і ў вёсцы!

76. Работнікі лясной, цэлюлозна-папяровай і дрэваапрацоўчай прамысловасці! Дадзім краіне больш драўніны, мэблі, цэлюлозы і паперы высокай якасці!

77. Работнікі лёгкай, харчовай і мяса-малочнай прамысловасці! Павялічвайце вытворчасць, паляпшайце асартымент, павышайце якасць тавараў народнага ўжытку!

78. Работнікі рыбнай прамысловасці! Павялічвайце ўлоў рыбы, паляпшайце якасць і зніжайце сабекошт рыбных прадуктаў!

79. Работнікі транспарту! Аснашчайце транспарт сучаснымі тэхнічнымі сродкамі! Лепш абслугоўвайце пасажыраў. Скарачайце тэрміны дастаўкі грузаў, зніжайце сабекошт перавозак!

80. Работнікі сувязі! Развівайце і ўдасканальвайце сродкі сувязі! Паляпшайце абслугоўванне насельніцтва!

81. Працоўныя Савецкага Саюза! Настойліва змагайцеся за ажыццяўленне намечаных XXIII з'ездам КПСС задач па далейшаму развіццю сельскай гаспадаркі нашай краіны ў новай пяцігодцы!

82. Працаўнікі сельскай гаспадаркі! Павышайце ўраджайнасць сельскагаспадарчых культур і прадуктыўнасць жывёлагадоўлі! Укараняйце ў вытворчасць дасягненні навукі і перадавы вопыт, дабівайцеся рэнтабельнасці кожнага калгаса і саўгаса!

83. Калгаснікі і работнікі саўгасаў! Змагайцеся за высокую культуру земляробства, усямерна павышайце ўрадлівасць глеб, дабівайцеся высокага ўраджаю з кожнага гектара зямлі!

84. Працаўнікі сельскай гаспадаркі! Шырэй разгортвайце спаборніцтва за ўзорнае правядзенне веснавой сяўбы!

85. Механізатары калгасаў і саўгасаў! Змагайцеся за ўздым сельскагаспадарчай вытворчасці! Лепш вывучайце, прадукцыйна выкарыстоўвайце і захоўвайце тэхніку!

86. Работнікі прамысловасці і сельскай гаспадаркі! Ад вашай самаадданай працы залежыць выкананне рашэнняў XXIII з'езда КПСС, які намеціў вялікую праграму павышэння дабрабыту савецкага народа. Змагайцеся за паспяховае выкананне планаў развіцця савецкай эканомікі!

87. Работнікі дзяржаўнага і кааператыўнага гандлю! Удасканальвайце гандаль і грамадскае харчаванне, лепш абслугоўвайце насельніцтва!

88. Работнікі службы быту! Усямерна паляпшайце абслугоўванне савецкіх людзей, паўней задавальняйце іх запатрабаванні!

89. Работнікі савецкіх устаноў! Чула адносьцеся да патрэб працоўных, выкараняйце бюракратызм і цяганіну!

90. Работнікі і актывісты народнага кантролю! Больш шырока і актыўна ўцягвайце працоўных у справу кантролю, змагайцеся за ўмацаванне дзяржаўнай дысцыпліны!

91. Работнікі навукі і вышэйшых навучальных устаноў! Змагайцеся за далейшы росквіт навукі, за тэхнічны прагрэс! Рыхтуйце спецыялістаў, вартых эпохі камунізма!

Слава перадавой савецкай навуцы!

92. Слава савецкім вучоным, канструктарам, інжынерам, тэхнікам і рабочым, якія адкрылі новыя гарызонты ў асваенні касмічнай прасторы!

Слава доблесным савецкім касманаўтам!

93. Работнікі культуры! Змагайцеся за выкананне рашэнняў XXIII з'езда КПСС, які паставіў важныя задачы па далейшаму развіццю сацыялістычнай культуры, расшырэнню і ўмацаванню яе матэрыяльнай базы! Усямерна паляпшайце культурнае абслугоўванне савецкіх людзей!

94. Дзеячы літаратуры і мастацтва! Змагайцеся за партыйнасць і народнасць, высокую ідэйнасць і мастацкае майстэрства твораў! Ярчэй адлюстроўвайце веліч і прыгажосць гераічных спраў савецкага народа, яго палымяны патрыятызм, барацьбу за перамогу камуністычных ідэалаў!

95. Работнікі асветы! Удасканальвайце народную адукацыю, выхоўвайце ў падрастаючага пакалення працавітасць, калектывізм, адданасць справе камунізма!

96. Медыцынскія работнікі! Змагайцеся за здароўе савецкага чалавека! Укараняйце ў практыку найноўшыя дасягненні медыцынскай навукі!

97. Няхай жыве наша сацыялістычная дзяржава! Няхай развіваецца і мацнее савецкая дэмакратыя, расце актыўнасць працоўных у кіраванні справамі краіны!

98. Працоўныя Савецкага Саюза! Прымайце актыўны ўдзел у выбарчай кампаніі! Правядзём выбары ў Вярхоўны Савет СССР пад знакам барацьбы за выкананне рашэнняў XXIII з'езда КПСС!

99. Працоўныя Савецкага Саюза! Выберам дэпутатамі Вярхоўнага Савета СССР лепшых прадстаўнікоў рабочых, калгаснікаў, савецкай інтэлігенцыі — дастойных будаўнікоў камуністычнага грамадства!

Няхай жыве і мацнее выпрабаваны жыццём блок камуністаў і беспартыйных!

100. Няхай жывуць савецкія прафсаюзы—школа камунізма!

101. Няхай жывуць савецкія жанчыны—актыўныя будаўнікі камуністычнага грамадства!

Слава жанчыне-маці, выхавацельніцы дзяцей, нястомнай працаўніцы на вытворчасці і ў быце!

102. Ветэраны працы і вайны! Прымайце больш актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці краіны, у выхаванні моладзі на рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях савецкага народа!

103. Няхай жыве Ленінскі камсамол — верны памочнік і рэзерв Камуністычнай партыі!

104. Юнакі і дзяўчаты! Настойліва авалодвайце ведамі, вучыцеся працаваць і жыць па-камуністычнаму!

Няхай жыве слаўная савецкая моладзь!

105. Піянеры і школьнікі! Добра вучыцеся, любіце і паважайце працу! Рыхтуйцеся стаць актыўнымі барацьбітамі за справу Леніна, за камунізм!

106. Камуністы! Будзьце ў авангардзе барацьбы за выкананне рашэнняў XXIII з'езда КПСС, за пабудову камунізма ў СССР!

107. Слава вялікаму савецкаму народу—доблеснаму будаўніку камунізма, мужнаму барацьбіту за свабоду, мір і шчасце ўсіх людзей на зямлі!

108. Няхай жыве вялікае непарушнае яднанне партыі і народа!

109. Няхай жыве Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік!

110. Няхай жыве наш родны Савецкі ўрад!

111. Няхай жыве створаная Леніным слаўная Камуністычная партыя Савецкага Саюза!

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ САВЕЦКАГА САЮЗА.

ПРАБЛЕМЫ І КЛОПАТ ПАЭЗІІ

[Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.].

савыя аўдыторыі. А хіба не запрашаюць нас яшчэ тыя ці іншыя таварышы на вечары, па сутнасці, дзеля галачкі, і мы выступаем не перад аматарамі і знаўцамі паэзіі, а часам зусім перад абыякавымі да паэзіі людзьмі? А мы павінны кожнага нашага сучасніка зрабіць аматарам і знаўцам паэзіі— і тады мы сапраўды з найбольшай аддачай будзем рабіць сваю справу выхавання новага чалавека. І калі мы не даходзім да масавага гарадскога чытача, то што ўжо гаварыць пра сельскага! Мы ўдзячны радыё і тэлебачанню, якія шмат чаго робяць для прапаганды нашай паэзіі, але няўжо большасць з нас лічыць, што гэтага досыць?!

Праблема гэта, на маю думку, вельмі важная, і яна мае надзвычай сур'ёзныя аспекты.

Некалькі пабочных прыкладаў. У нас сапраўды масавы фізкультурны рух. У якіх формах ён знайшоў сябе? У формах спартыўных клубаў. А чаму б нам не падумаць аб клубах паэзіі? Іх можна стварыць у кожным горадзе, у кожным сяле—пры клубах, пры бібліятэках, школах, тэхнікумах, вну, на заводах і г. д. Ініцыятыву тут, мне здаецца, мог бы праявіць камсамол—перш за ўсіх моладзь захапляецца паэзіяй. А там да клубаў далучыліся б бібліяфілы (іх у нас становіцца ўсё больш і больш!), настаўнікі, інжынеры, рабочыя, калгаснікі—людзі ўсіх прафесій і ўзростаў. Практыку арганізацыі такіх клубаў мы маглі б пэўным чынам пераняць у нашых сяброў з сацыялістычнай Чэхаславакіі, дзе такія клубы даўно існуюць.

Арганізацыя клубаў паэзіі — гэта не толькі справа далучэння да паэзіі масавага чытача, справа яго непасрэднага выхавання на здабытках паэтычнага слова. Клубы могуць стаць таксама пасрэднікамі паміж пакупніком паэзіі і выдавецтвамі. У Чэхаславакіі, напрыклад, тыражамі ў пэўнай ступені «камандуюць» клубы. Яны заказваюць кнігі паэтаў, прычым, адразу ж сабраўшы матэрыяльныя сродкі: член клуба хоча мець кнігу і за яе «наперад» плоціць.

Клубы паэзіі ў Чэхаславакіі арганізавалі, па сутнасці, і шырокае выданне класікаў сусветнай паэзіі. Ёсць распрацаваны наперад план выдання, праца перакладчыкаў таксама «наперад» аплачана пакупніком. А як у нас? У нас, у Маскве, выходзіць вядомая серыя «Здабыткі лірычнай паэзіі». Паспрабуйце купіць яе: попыт каласальны, а тыраж—пяцьдзесят тысяч. А былі б у нас клубы паэзіі, яны б падказалі больш рэальны тыраж, ды яны б яго і фінансавалі. Ці не з'яўляецца гэта прыймальнай формай гаспадарчага разліку ў паэзіі?

СВАЕЙ ідэйнай перакананасцю, сваім якасным ростам наша паэзія наблізілася да чытача яшчэ больш. Прыкласці максімум арганізацыйнага ўмення, каб гэта набліжэнне замацаваць і расшырыць—гэта, мне думаецца, цяпер вельмі важна.

Мы шчаслівыя яснасцю сваіх грамадскіх ідэалаў. Мы ведаем, што гэтая яснасць не здымае канфліктаў развіцця, суровасці і бязлітаснасці дыялектыкі. І гэта залог таго, што, ідучы ад жыцця, мы даб'ёмся ў паэзіі яшчэ большых поспехаў, з яшчэ большай дзейснасцю будзем служыць нашай вялікай сучаснасці.

ЗДЫМАЮЦЬ фотааматары

СПЫНЕНАЕ ІМГНЕННЕ

З фотаздымкамі выкладчыка Беларускага інстытута фізкультуры Аляксандра Глінскага мы ўжо знаёмілі сваіх чытачоў. Малады фотааматар шмат увагі аддае пейзажу, але «не забываецца» і на людзей. Ён умее ўлавіць тое рэдкае імгненне, калі найбольш поўна раскрываецца характар чалавека. Для многіх яго здымкаў характэрна дакладная кампазіцыя, ён стараецца пазбягаць выпадковых, непатрэбных дэталей.

Сёння мы прапануем вашай увазе некалькі новых здымкаў фотааматара.

СУР'ЁЗНАСЦЬ — ГАЛОЎНАЕ ДЛЯ МУЖЧЫНЫ.

А МОЖА...



КАЛІ ВАКОЛ СПАКОЙНА.



ДЫК ВОСЬ ЁН ЯКІ, РЭАКТЫЎНЫ!



ПАВОДКА.

МАСКОЎСКАЯ ТЭЛЕВІЗІЙНАЯ

У Маскве на вялікай пляцоўцы побач з Астанкінскай сажалкай будуецца тэлевізійная вежа вышынёю 525 метраў. Будаўнікі ўжо вядуць работы на 250-метровай адзнацы. Яны ўкладваюць бетон і робяць мантаж металічных канструкцый ствала вежы. Праект збудавання распрацаваны інжынерам-канструктарам Мікалаем Нікіціным, архітэктарамі Леанідам Баталавым і Дзмітрыем Бурдзіным.

Мікалай Нікіцін у гутарцы з карэспандэнтам Агенцтва друку Навіны расказаў:

— Тэлевізійная вежа ў Астанкіна будзе на 225 метраў вышэйшая за славутую Эйфелеву вежу, на 203 метры — за вежу, пабудаваную нядаўна ў Токіо, на 145 метраў — за нью-йоркскі небаскроб Эмпайр Стэйт Білдзінг. Тэлевізійныя збудаванні, вышыня якіх дасягае 500 метраў, ёсць толькі ў ЗША. Гэта гіганцкія металічныя мачты з адцяжкамі з тросаў. Але мачты служаць толькі апорамі для антэн. У адрозненне ад іх на вышыннай вежы, што будуецца ў Маскве, апрача антэн, будуць шматлікія памяшканні, дзе размесцяцца станцыі, якія перадаюць і прымаюць, ультракароткахвалевая перадаючая апаратура, прыстасаванні радыёрэлейных ліній, а таксама шмат іншага абсталявання.

На вежы запраектаваны тры глядзельныя вышынныя пляцоўкі. Верхняя — на вышыні 340 метраў. На ёй змогуць адначасова знаходзіцца да 500 чалавек. На гэтай жа вышыні ў трох паверхах размесціцца рэстаран на 300 месц. Вежа будзе абсталявана некалькімі скарасными ліфтамі.

Такая буйная вежа спраектавана ў сусветнай практыцы ўпершыню. Збудаванне адпавядае самым строгім патрабаванням трываласці, надзейнасці і даўгавечнасці. Вежа зручная ў эксплуатацыі, не патрабуе перыядычнай афарбоўкі, непазбежнай для металічных збудаванняў. Архітэктурнае яе аблічча своеасаблівае і не паўтарае іншых збудаванняў.

Пры агульнай вазе вежы ў 41 тысячу тон унікальны фундамент яе закладзены на параўнальна невялікую глыбіню — 3,5 метра. Гэтага дастаткова, бо дыяметр плошчы апоры роўны 70 метрам. Фундамент, канічная частка і ствол вежы робяцца з маналітнага, папярэдне напружанага жалезабетону. Яго спатрэбіцца ўкласці тут больш 15 тысяч кубаметраў. Ствол будзе мець папярэдняе напружанне ў бетоне прыкладна 10 тысяч тон. Гэта напружанне ствараюць 180 стальных канатаў, якія закладваюцца на розных вышынях ствала ў каналы і нацягваюцца магутнымі дамкратамі знізу. Папярэдняе напружанне ў шэсць тысяч тон прадугледжана ў маналітным фундаменце вежы. Усё гэта дазволіць захоўваць бетонныя канструкцыі ад трэшчын і забяспечыць іх даўгавечнасць.

Верхняя частка вежы зможа вытрымаць націск ураганнага ветру хуткасцю да 50 метраў у секунду. Сярэдняя ж хуткасць ветру Падмаскоўя складае трычатыры метры ў секунду, а найвышэйшая, якая назіралася за многія гады, дасягнула 17 метраў у секунду. Пад уплывам парываў ветру вежа будзе хістацца. Размах ваганняў яе вяршыні пры звычайным ветры не перавысіць паўметра. А раз у 50 гадоў магчыма амплітуда вагання да трох метраў. Аднак гэтыя ваганні зусім бяспечныя.

Распрацаваны арыгінальныя метады вядзення работ па збудаванню вежы. Бетаніраванне яе ствала вядзецца пры дапамозе самападзёмнага агрэгата, спраектаванага супрацоўнікамі інстытута «Прамстальканструкцыя». Гэта шагаючая ў вертыкальным напрамку ўцепленая закрытая пляцоўка, у якую пад'ёмнікі падаюць бетон і арматуру.

Мантаж самай высокай часткі вежы— 140-метровай металічнай мачты для антэны будзе ажыццёўлены пры дапамозе самападзёмнага крана. На вышынных пляцоўках будуць сабраны металічныя секцыі. Затым кран метадам нарошчвання паступова ўзніме іх да патрэбнай вышыні.

Распрацаваны праект ілюмінацыі вежы ў начны час. Магутныя пражэктары асветляць яе вышынную частку знізу каляровымі праменнямі, якія будуць відаць на адлегласці больш чым сто кіламетраў.

Побач з жалезабетоннай тэлевізійнай вежай будуецца новы Усесаюзны тэлевізійны цэнтр.

Галоўны інжынер праекта, супрацоўнік Праектнага інстытута Міністэрства сувязі СССР Уладзімір Рэнард расказвае пра будучы тэлецэнтр:

— Аб'ём будынка складзе каля мільёна кубічных метраў, а яго карысная плошча — 117 тысяч квадратных метраў. Апаратна-студыйны комплекс працягласцю ў 400 метраў, вышынёю ў 4 і 12 паверхаў будуецца са зборных жалезабетонных канструкцый. У комплексе будзе 14 асноўных студый, апаратныя, артыстычныя, касцюмерныя, грымёрныя, жывапісна-дэкаратыўныя залы, сховішчы для фільмаў, фанатэка, канферэнц-зала і іншыя памяшканні.

Чатыры студыі прызначаны выключна для стварэння тэлевізійных фільмаў. Метад шматкамернай здымкі з ужываннем тэлевізійных сродкаў дазволіць значна паскорыць выпуск фільмаў. У сярэднім тут будзе штогод ствараццa каля 150 тэлевізійных фільмаў.

Новая прагрэсіўная тэхналогія забяспечыць аб'ём вяшчання па чатырох праграмах чорна-белага і адной — каляровага тэлебачання ў сярэднім да 50 гадзін у суткі. Асноўныя студыі будуць выкарыстаны толькі па прамым прызначэнні, для «жывых» перадач і рэпетыцый. Усе камбінаваныя перадачы — паказ кінафільмаў, трансляцыі з тэатраў і канцэртных залаў, рэпартажы з месц будуць весціся з праграмных апаратных, дзе ствараюцца невялікія студыі для дыктара. Ён пры дапамозе дыстанцыйных сродкаў будзе збіраць праграму з розных студый і аб'яўляць гледачам. Апрача таго, на тэлецэнтры прадугледжваецца стварэнне блока перакладаў, дзе можна будзе любую перадачу дубліраваць на 12 мовах.

Высокая гукавая ізаляцыя ў студыі, механізацыя транспарціроўкі і ўстаноўкі дэкарацый, дыстанцыйнае кіраванне асвятляльнай апаратурай — усё гэта дазволіць ствараць самыя высакаякасныя тэлевізійныя перадачы.

У двух з палавінаю кіламетрах ад студыйна-апаратнага комплексу будуецца база перасоўнай тэхнікі — аўтамабіляў для тэлерэпартажу і кіназдымкі тэлевізійнага цэнтра. Тут будуць пабудаваны гаражы і рамонтныя майстэрні.

Усё абсталяванне новага тэлецэнтра распрацоўваецца савецкімі канструктарамі і інжынерамі. Першая чарга Маскоўскага тэлецэнтра павінна быць здадзена ў эксплуатацыю да 50-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі — у 1967 годзе.

Ігар ЦВЯРСКОЙ,
карэспандэнт АДН.

УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВА

Пры Івянецкім Доме культуры ўжо другі год працуе народны універсітэт культуры і мастацтва. У ім займаюцца каля 200 чалавек.

За апошні час праведзены заняткі на тэмы: «Класічная савецкая і зарубежная музыка». «Італьянская опера». Заняткі суправаджаліся канцэртамі-лекцыямі з удзелам Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

Слухачы універсітэта з цікавасцю слухаюць і лекцыі па літаратуры. Нядаўна адбыліся заняткі па тэме «Якуб Колас і Янка Купала — заснавальнікі і класікі беларускай літаратуры». Лекцыю трачытала настаўніца мясцовай сярэдняй школы М. Каспяровіч. Вучні старэйшых класаў прачыталі ўрыўкі з твораў народных паэтаў.

Я. МАКОУСКІ.
Валожынскі раён.

НОВЫЯ НАЗВЫ НА АФІШАХ

НА СЦЭНЕ КОЛАСАЎЦАЎ

Днямі тэатр імя Якуба Коласа паказаў новы спектакль «Сэрца на далоні» па раману І. Шамякіна. Інсцэніроўка для тэатра— А. Падабеда.

Спектакль паставіў заслужаны артыст Казахскай ССР А. Падабед, мастацкае афармленне заслужанага дзеяча мастацтва БССР Я. Нікалаева, кампазітар Б. Насоўскі. Ролі выконваюць: народы артыст СССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі А. Ільінскі (Гукан), народныя артысты БССР А. Шэлег (Яраш), А. Трус (Шыковіч), А. Радзяволўская (Клаўдзія Сухадол), заслужаныя артысты БССР Я. Мацісава (Галіна Адамаўна), З. Канапелька (Валянціна Андрэеўна), І. Матусевіч (Дымар), артысты Г. Маркіна (Зося), В. Кліменка (Маша), В. Анісенка (Славік), І. Вашкевіч (Тарас) і іншыя.

Сваю новую работу калектыў коласаўцаў прысвяціў 50-годдзю Савецкай улады.

Б. ФРЭЙДКІН.

СУСТРЭЧА СА ШТРАУСАМ

Прэм'еру аперэты Іягана Штрауса «Лятучая мыш» падрыхтаваў Магілёўскі абласны тэатр музычнай камедыі. Спектакль паставіў галоўны рэжысёр тэатра В. Амельчанка, дырыжор — В. Ражкоўскі, мастак — І. Чумакоў, балетмайстар — Д. Харчанка.

Магіляўчане цёпла прынялі работу музычнага тэатра.

А. КУКШЫНСКІ.

НАШ СЯБАР З ЮГАСЛАВІІ

На ўзбярэжжы Адрыятычнага мора, у югаслаўскім горадзе Рыека жыве і працуе добры сябар беларускай паэзіі, яе перакладчык і прапагандыст Бран Месаравіч-Дзівошыч.

Адзін са старэйшых югаслаўскіх перакладчыкаў, які наблізіў да чытача сваёй краіны творы рускіх класікаў—А. Пушкіна, М. Лермантава, І. Крылова, Б. Месаравіч-Дзівошыч у апошнія гады плённа займаецца беларускай паэзіяй. Першыя яго пераклады — нізка вершаў Петруся Броўкі з кнігі «А дні ідуць»—былі апублікаваны ў 1963 годзе ў пятым нумары часопіса «Рыечка рэвія». Перакладчыка асабліва зацікавіла тое, што ў вершах нашага паэта арганічна спалучаюцца традыцыі народнай творчасці і сучаснай паэтыкі.

У лістах да нашых славістаў — кандыдата філалагічных навук Л. Цімашковай і навуковага супрацоўніка Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР Л. Самасейкі—Бран Месаравіч-Дзівошыч піша, што ў паэтычным гучанні беларускага слова ён бачыць многа агульнага з серба-харвацкай мовай, гэтак жа, як многа падабенства і ў гісторыі нашых народаў.

«Якое цудоўнае слова «сябар»,— усклікае ён,—слова, якое нам, сербам, нагадвае нашу гісторыю, калі ў сярэднія вякі чалавека з народа, селяніна звалі «себар», а народ, просты люд—«себры», сябры, прыяцелі па-сербску... Ды колькі яшчэ ёсць беларускіх слоў, якія здаюцца зусім сербскімі (і наадварот), што сведчыць пра безумоўную агульнасць нашага паходжання...».

Па ініцыятыве Б. Месаравіча-Дзівошыча радыё горада Загрэба арганізавала перадачу «Беларускія народныя песні» — па пласцінках, якія прыслала Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з заграніцай.

А ў адным з апошніх нумароў часопіса «Рыечка рэвія» за мінулы год змешчана ў перакладзе Б. Месаравіча-Дзівошыча падборка вершаў дзевяці беларускіх паэтаў: П. Броўкі, М. Танка, П. Панчанкі, С. Грахоўскага, В. Вітні, Н. Чарнушэвіча, Р. Барадуліна, Е. Лось і Я. Лукашэвіча.

У планах Б. Месаравіча-Дзівошыча — падрыхтоўка зборніка «Беларуская паэзія» да 50-й гадавіны Кастрычніка.

«Я хачу зрабіць столькі, колькі змагу,—заяўляе наш югаслаўскі сябар,—каб у нас, у Югаславіі, беларускі народ і яго культура занялі тое месца, якога яны сапраўды варты».

А. МАЖЭЙКА.

У памяшканні Мінскага цырка пачаў свае гастролі адзіны ў Савецкім Саюзе цырковы калектыў ліліпутаў, мастацкім кіраўніком якога з'яўляецца Ганна Рускіх. У праграме паказу: паветраныя гімнасты, групавыя і партэрныя акрабаты, эквілібрысты, музычныя эксцэнтрыкі і інш. У вяўзах выступаюць клоуны-парадысты В. Крывой, А. Мамулевіч і К. Сірэнка.

На гэтым здымку вы бачыце клоуна, акрабата і эксцэнтрыка на дроце Анатоля Мамулевіча.

ПАЭТ-ПЕСЕННІК У СТУДЭНТАЎ

На гаты раз госцем клуба жывога слова ў Мінскім педагагічным інстытуце імя А. М. Горкага быў вядомы паэт-песеннік Адам Русак. На вечары гучалі вершы, звінелі песні, створаныя на словы паэта. А самым цікавым было выкананне новай песні «Балада пра Мінск». Словы да яе напісаў А. Русак за некалькі дзён да сустрэчы, а музыку стварыў выкладчык інстытута П. Ахраменка. Песню выканаў студэнт літаратурна-музычнага факультэта А. Нічыпаровіч.

Вечар закончыўся традыцыйнай «Бывайце здаровы».

В. БЕКІШ.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

19 красавіка

Першая праграма. 11.00 — «Панарама Радзімы» (М). 11.30 — «Па ленінскай пуцёўцы». Тэлевізійны фільм (М). 11.55 — для школьнікаў. «Карусель» (М). 12.45 — «Галы, ачкі, секунды» (М). 12.55 — «Ленін у Швейцарыі». Тэлевізійны фільм. Першая частка (М). 13.45 — «Музычны кіёск» (М). 16.45 — праграма перадач. 16.50 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Вясна, вясна на вуліцы» (М). 17.30 — «Праменні, якія пранікаюць усюды». Перадача з Запарожжа. 18.00 — міжнародная сустрэча па боксу. «Спартак» (БССР) — зборная Даніі. 20.00 — тэлевізійныя навіны. 20.15—«Прывітанне табе, Узбекістан!» Да Дэкады беларускага мастацтва і літаратуры. 20.40 — ленінскія чытанні (М). 20.50 — «Васемнаццаты год». Другая серыя кінатрылогіі па раману А. Талстога «Блуканне па пакутах». 22.30—канцэрт лаўрэатаў Ленінскай прэміі (М). 23.00 — «Пе-капцёр». Кароткаметражны фільм.

Другая праграма. 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.30 — па матэрыялах XXIII з'езда КПСС (М). 19.10 — на стадыёнах і спартыўных пляцоўках. Хакей. «Спартак» — «Дынама» (М). У перапынках — тэлевізійныя навіны (М). 20.40 — «Кінамеханік Баранаў». Кінанарыс. 20.50 — В. Дружынін. «Гатычная ружа». Прэм'ера тэлеспектакля. Перадача з Ленінграда. 21.40 — для юнацтва. «Шукальнікі» (М).

20 красавіка

Першая праграма. 11.00 — тэлевізійныя навіны (М). 11.15 — «Пераўтвораны край». Тэлевізійны фільм (М). 11.40 — для школьнікаў. «Піянерыя». Перадача з Львова. 12.25 — «Ленін у Швейцарыі». Тэлевізійны фільм. Другая частка (М). 13.15 — першынство СССР па хакеі. «Спартак» — «Дынама». Трэці перыяд. (У запісе) (М). 16.45 — праграма перадач. 16.50 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Пра Леніна — акцябратам» (М). 17.20 — «Проба сіл». Пра першынство дзіцячых спартыўных школ па гімнастыцы. 17.30 — «Дарога без прывалаў». Перадача, прысвечаная саракапяцігоддзю газеты «Чырвоная змена». 18.10 — тэлевізійныя навіны 18.30 — «Першая Бастылія». Шырокаэкранны мастацкі фільм. Вытворчасць кінастудыі «Ленфільм». 19.50 — рашэнні XXIII з'езда КПСС. — у жыццё. Інтэрв'ю міністра лясной, цэлюлозна-папяровай і дрэваапрацоўчай прамысловасці А. Я. Кійкова. 20.20 — «Ці не забыліся вы?» Навукова-папулярны фільм. 20.30 — тэлевізійныя навіны (М). 20.55— Міжнародная таварыская сустрэча па футболу. Венгрыя—Польшча. Перадача з Венгрыі. 22.50 — «Народны кантроль». «Тайны пуцявых лістоў». 23.10 — па вашых заяўках. Спявае Людміла Зыкіна.

Другая праграма. 17.20 — па матэрыялах XXIII з'езда КПСС. «Эканамісты за «круглым сталом» (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.10 — музыка С. Пракофьева (М). 18.50 — «Гэта патрэбна рэспубліцы». Дакументальны фільм (М). 19.05 — «Навука—вытворчасці» (М). 19.30 — літаратурны тэатр. «Што любіў Ул. І. Ленін з мастацкай літаратуры» (М). 20.30 — «Мускаўіт — цудоўны камень». Тэленарыс. 20.50 — рэклама, аб'явы. 21.00 — «Вясеннія галасы». Фільм-канцэрт.

21 красавіка

Першая праграма. 17.05 — праграма перадач. 17.10 — рашэнні XXIII з'езда КПСС — у жыццё. «Народжаныя хіміяй». Рэпартаж з інстытута будаўніцтва і архітэктуры АН БССР. 17.40 — тэлевізійныя навіны. 18.00 — першынство СССР па футболу. «Дынама» (Тбілісі) — ЦСКА. Перадача з Тбілісі. 18.45 — «Наш XXIII». Ленінскай партыі прысвячаецца. Прэм'ера тэлевізійнага фільма (М). 20.00 — школьная фільматэка. «Хмарная раніца». Трэцяя серыя кінатрылогіі па раману А. Талстога «Блуканне па пакутах». 21.40 — «Вечна жывы». Вобраз Ул. І. Леніна ў мастацтве і кіно. 22.30 — «Прырода і мы». Заключны тур віктарыны.

Другая праграма. 16.50 — «Тэлевізійны эканамічны веснік» (М). 17.40 — тэлевізійныя навіны (М). 18.00 — па роднай краіне. «Там, за Паляноным». «На Волзе». Кінанарысы. 18.20 — «Два мушкецёры». Кінакамедыя. 20.00 — знаёмства з операй. Опера Ц. Хрэннікава «У буру». Спектакль музычнага тэатра імя К. С. Станіслаўскага і У. І. Неміровіча-Данчанкі (М). У перапынках — тэлевізійныя навіны (М).

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25 25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, нарэспандэнцкага пункта ў Гомелі — 2-70-83, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-97-44.

«Литература и искусство»—орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда».

Індэкс 63856. АТ 00877.